Ігнараваньне зяблева—злачынная недаацэнка дырэктывы партыі

Прапетары ўсіх краў, злучайцеся!

ЗЬВЯЗДА

Орган ЦК і Мен. Гаркому Камуністычнай партыі (б) Беларусі.

Год выданьня—XV
№ 293 (4199)
Аўторак, 27 кастрыч. 1931 г.
Выходзіць БЕСЬПЕРАПЫННА.

аб арганізацыйна-гаспадарчым умацаваньні калгасаў

Апартуністычная бязьдзейнасьць і самацёк замест мабілізацыі шырокіх мас калгасьнікаў, аднаасобнікаў і злоснае невыкананьне пастановы НКЗ аб перакідцы цягі на ворыва—галоўныя прычыны зрыву зяблева ў саўгасе імя Дзесяцігодзьдзя БССР, у Крупскім і Вушацкім раёнах

Рашуча пакончыць з апартуністычнай недаацэнкай важнейшай палітычна-гаспадарчай кампаніі.—Раённыя арганізацыі абавязаны забясьпечыць неадкладны круты пералом

Перавыбары парторганаў на транспарце—пад знакам барацьбы за ажыцьцяўленьне загаду тав. Андрэева

Асеньня-зімовыя перавозкі — сур'ёзны палітычны экзамэн для ўсіх транспартных партарганізацый. Пасьпяховае яго вытрымаць магчыма толькі пры ўмове поўнага выкананьня ўказаньняў тав. Сталіна, ажыцьцяўленьня загаду тав. Андрэева, узмоцненай мабілізацыі рабочых чыгуначнікаў на павышэньне ЯКАСЬЦІ работы паравознага і вагоннага парку. Гэтыя ўмовы зьяўляюцца вузлавымі рашаючымі для партарганізацый, яны павінны легчы ў аснову штодзённай дзейнасьці ўсіх зьвеньняў транспартных арганізацый КП(б)Б.

Неразуменьнем АСНОЎНЫХ ЗАДАЧ, няўменьнем ўхапіцца за галоўныя вузлавыя пытаньні,—толькі гэтым можна вытлумачыць наўнасьць тых прарываў, якія ёсьць на сёньняшні дзень на радзе вучасткаў нашага транспарту.

Цэнтральны Камітэт КП(б)Б нядаўна заслухаў даклады аб рабоце ЖЛОБІНСКАГА дэпо і Віцебскага чыгуначнага вузла. ЦК КП(б)Б у сваіх пастановах канстатаваў наўнасьць ДРЭННАЙ падрыхтоўкі да АСЕНЬНЯ-ЗІМОВЫХ ПЕРАВОЗАК, наўнасьць шматлікіх прарываў у ажыцьцяўленьні мерапрыемстваў, намеераных на аздараўленьне ПАРАВОЗНАЙ гаспадаркі, на павышэньне тэмпаў работы транспарту. На Віцебскім вузьле за 2-ю пяцідню верасьня зрывы спаранай язды па пасажырскіх цягніках дасягаюць 11 проц. і па таварных 15 проц.

Надзвычай яшчэ высокі процант хворых паравозаў (28,8 проц. замест 18 проц.).

Прарывы ў рабоце ЖЛОБІНСКАГА дэпо характарызуюцца: слабым замацаваньнем спаранай язды, невыкананьнем заданьняў па оярэдня-сутачным прабегу пасажырскіх і таварных паравозаў і пагаршаньнем гэтых паказальнікаў у параўнаньні з піпенем. У той час, калі саданьне прабегу для пасажырскіх паравозаў 240 клм, у жніўні мы наглядаем рэзкае зьніжэньне — толькі 220 клм. Па таварных-жа цягніках на працягу 3-х месяцаў, пачынаючы ад піпеня і канчаючы верасьнем наглядаецца паступовае зьніжэньне.

Незадавальняюча ўкараняецца гаспадарчы разрахунак, усё яшчэ ёсьць у наўнасьці абязьлічка, у радзе цэхаў пануе ўраўнілаўка.

Іменна гэта аказвае адмоўны ўплыў на выразную работу чыгункі. Прычынай адставаньня зьяўляецца тое, што гэтыя транспартныя партарганізацыі не перабудавалі сваёй работы ў адпаведнасьці з дырэктывамі ЦК УсеКП(б) і ЦК КП(б)Б, не перанесьлі цэнтру цяжару ля ў нізавое вытворчае зьвяно: ЦЭХ, ГРУПУ і ПАРАВОЗНУЮ брыгаду. Рад партыйных калектываў і нізавых партыйных зьвеньняў вядуць невыстарчальна жорсткае змаганьне з праявамі непаваротлівасьці, коснасьці і бюракратызму, якія маюць месца ў асобных кіруючых зьвеньнях на транспарце.

Партыйная АСЬВЕТА, як магутны сродак мабілізацыі партыйных і рабочых мас на выкананьне дырэктыў партыі аб сацыялістычнай рэканструкцыі транспарту, аб выкананьні асеньня-зімовых перавозак — некаторымі партарганізацыямі не скарыстоўваецца. Марксыцка-ленінскае выхаваньне ў партарганізацыях Полацкага і Менскага чыгуначных вузлоў разгорнута невыстарчальна. Партыйныя калектывы зусім слаба кіраваді камплектаваньнем сеткі, не дабіліся сваячасовага пачатку заняткаў і ўвязкі работы партшкол з работай камуністаў і беспартыйных рабочых на вытворчасьці.

Усё яшчэ слаба разгорнута палітычна-масавая работа ў нізавых вытворчых зьвеньнях, асабліва на паравозных брыгадах. Апошнія ў шматлікіх выпадках прадастаўлены самі сабе, не забясьпечаны штодзённым партыйным кіраўніцтвам

СПРАВАЗДАЧНА-ПЕРАВЫБАРЧАЯ КАМПАНІЯ ПАРТОРГАНАЎ, ЯКАЯ ПАЧЫНАЕЦЦА 15 ЛІСТАПАДА Ў ТРАНСПАРТНЫХ ПАРТАРГАНІЗАЦЫЯХ, ПАВІННА ПРАЙСЬЦІ ПАД ЗНАКАМ ПОЎНАГА ЎКАРАНЕНЬНЯ ГАСПАДАРЧАГА РАЗРАХУНКУ НА ЎСЕ ПАРАВОЗЫ, БРЫГАДЫ ПА ІХ РАМОНЦЕ, ПА РАМОНЦЕ ПУЦІ І СЛУЖБЫ РУХУ. Ператварыць паравоз, на аснове ўкараненьня гаспадарчага разрахунку, у самастойную адзінку, а машыніста — ў сапраўднага дырэктара паравозу — вось лёзунг, ажыцьцяўленьне якога павінен дабіцца кожны партклектыў, кожная нізавая парт'ячэйка.

Зрывы спаранай язды, якія на чыгуначных вузлох бываюць досыць часта, ставяць перад партыйнымі арганізацыямі задачу шчыльней падыйсьці да гэтага важнейшага мерапрыемства, накіраванага на аздараўленьне паравознай гаспадаркі. Наносячы руйнуючы ўдар па ўсялякіх праявах ФАРМАЛЬНАГА ўвядзеньня СПАРАНАЙ язды, трэба ўзмацніць мабілізацыю мас на ажыцьцяўленьне гэтай важнейшай задачы. Партыйныя ячэйкі павінны ўжыць усе меры для таго, каб зьнізіць процант ХВОРЫХ ПАРАВОЗАЎ, дабіцца лепшай ЯКАСЬЦІ іх рамонту.

У радзе месц усё яшчэ пануе ўраўнілаўка ў зарплаце. Асабліва гэта рэзка заўважаецца на ГОМЕЛЬСКІМ чыгуначным вузьле. Калі, дасягнуты поўным посьпехі ў паравозе машыністаў, іх па мочнікаў і качагараў на новую сыстэму аплаты працы, што значна павышае іх заработак, дык гэтага нельга сказаць ад носна іншых груп рабочых. Напрыклад, сьлесар 8-га разраду атрымлівае менш за столяра гэтага-ж разраду і яшчэ менш за іх абодвых атрымлівае каваль. Партыйныя арганізацыі павінны абвясьціць самую жорсткую барацьбу ЎРАЎНІЛАЎЦЫ, павінны яе канчаткова ЛІКВІДАВАЦЬ і гэтым самым ўзьняць прадукцыйнасьць працы рабочых.

Кожны камуніст-транспартнік павінен ужыць усе меры для таго, каб поўнасьцю выканаць план асеньня-зімовых перавозак. Для гэтага кожны камуніст у часе справаздачна-перавыбарчай кампаніі павінен прыняць актыўны ўдзел у арганізацыі паказу таго, як тая ці іншая ячэйка, або парткалектыў змагаюцца за рэалізацыю прамовы тав. Сталіна і загаду тав. Андрэева

ПЕРАВЫБАРЫ Ў ТРАНСПАРТНЫХ ПАРТАРГАНІЗАЦЫЯХ ЗЬЯВЯЦЦА МАГУТНЫМ ФАКТАРАМ У СПРАВЕ САПРАЎДНАЙ ПЕРАБУДОВЫ ПАРТРАБОТЫ ТВАРАМ ДА ВЫТВОРЧАСЬЦІ. У ЦЭХ, ГРУПУ І ПАРАВОЗНУЮ БРЫГАДУ ПЕРАНЕСЬЦІ ЦЭНТР ЦЯЖАРУ ПАРТЫЙНАЙ РАБОТЫ. Там вырашаецца пёс барацьбы за выкананьне вышэйпералічанай. Гэта трэба цьвёрда запомніць і няўхільна ажыцьцяўляць кожнаму зьвяну партарганізацыі транспарту.

Падрыхтоўка да справаздачна-перавыбарчай кампаніі кіруючых парторганаў супадае з МЕСЯЧНІКАМ ПРАВЕРКІ ВЫКАНАНЬНЯ ДЫРЭКТЫЎ ПАРТЫ І ЗАГАДУ ТАВ. АДРЭЕВА АБ РАБОЦЕ ТРАНСПАРТУ.

Мабілізаваць масы на ўсебаковую гпы бокую праверку, таго, як укараніліся спаранная язда, наколькі ліквідавана абязьлічка, наколькі шырока разгорнута змаганьне за ўзмацненьне паравознай гаспадаркі, як ажыцьцяўляюцца канкрэтныя ўказаньні тав. Сталіна і тыя практычныя мерапрыемствы, якія паказаны ў загадзе тав. Андрэева; злучыць гэту праверку з агладам партыйнай работы —гэта ўдарная работа кожнага партыйнага зьвяна на транспарце.

Раённыя партарганізацыі павінны ЎЗМАЦНІЦЬ сваё кіраўніцтва і дапамогу парткалектывам і ячэйкам. ЦК КП(б)Б у сваёй пастанове аб рабоце Жлобінскага дэпо адзначыў, што РК часамі перакідваюць работнікаў транспарту ў іншыя арганізацыі. ЦК КП(б)Б даў указаньні аб недапушчэньні такіх мэмантаў.

Разгортваючы жорсткую бальшавіцкую самакрытыку, змагаючыся супроць правых і «левых» апартуністаў партыйныя арганізацыі транспарту забясьпечаць пасьпяховае правядзеньне асеньня-зімовых перавозак, ператвораць транспарт у перадавы вучастак сацыялістычнага будаўніцтва.

Раўняцца па калгасе „Камунар"

ВУШАЧЫ. (Наш кар.).

У Вушацкім раёне павінна быць заазблена 19.500 га, з якіх у калгасах 11.289 га. Палітычная недаацэнка зяблевай кампаніі прывяла да вялізарнага прарыву. **Калгасы зазяблілі ўсяго 3.428 га — 30,3 пляну. Асабліва адстаюць калгасы Зарачанскаг Весьніцкага і М. Дзяцкага** сельсаветаў, якія выканалі свае пляны ад 9 да 16 проц.

Лепш стаіць справа ў калгасах Кубліцкага, Гарбаціцкага і Чарапоўшчынскага сельсаветаў, якія выканалі свае пляны на 55-70 проц.

Усайскі, Глыбачанскі, Сарачынскі, Заваўзьлскі, Вацлаваўскі, Весьніцкі і інш. сельсаветы злачынна агнгруюць арганізацыю зяблева ў аднаасобным сэктары, дзе плян выканан на больш чым на 5 проц.

Раённыя арганізацыі павінны прыняць рашучыя меры да ліквідацыі прарыву, мабілізаваўшы масы на поўнае выкананьне пляну. Трэба рашуча ўдарыць па апартуністычнай недаацэнцы індывідуальнага сэктару.

* * *

У адозьве да ўсіх калгасаў БССР калгас «Камунар», Гарбаціцкага сельсавету Вушацкага раёну, узяў на сябе рад канкрэтных абавязацельстваў па зяблеве, уборцы бульбы, збожжазагатоўках, апрацоўцы ільну і г. д.

Устанавіўшы канкрэтныя тэрміны сканчэньня пасобных работ, «Камунар» па-бальшавіцку выконвае свае абавязацельствы.

На 15-га кастрычніка зазяблена 270 га. Плян выканан на 80 проц. Я. Л.

Перакінута толькі 36 проц. транспарту

СОСНЫ. (Ад наш. спецкора). У выніку адсутнасьці выразнага пляну правядзеньня зяблева, кампанія ў саўгасе «10-годзьдзя БССР» (Любаньскі раён) ідзе пагрозай зрыву. Саўгас павінен узараць 1.500 гэкт. Між тым на 21-га кастрычніка **плян** ворыва **выканан** усяго толькі **на 53 проц. Пастанова НКЗ абавязвала перакінуць на зяблева 80 проц. трактараў, але дырэкцыя саўгасу напляваецельскі адмеслася да гэтай пастановы і нічога не зрабіла для яе выкананьня.**

З наяўных 58 трактараў толькі 26 маюць адпаведны прычэпны інвэнтар (балотныя плугі, якія могуць быць скарыстаны на зяблевым ворыве). 26 трактараў знаходзяцца ў калгасах, а астатнія ў рамонце.

Ня гледзячы на абмежаваную колькасьць трактараў, якія могуць прапаўзаць на балоце, **гэты склад скарыстоўваўся і скарыстоўваецца нерацыянальна і не па прызначэньні.** Так, 20-га кастрычніка на зяблевым ворыве працавала 16 трактараў, 19-га — 12 і 21-га — 19, а ўсе астатнія трактары (з 26 маючых балотныя плугі) працавалі на транспартных перавозках. У самы разгар зяблевай кампаніі, пачынаючы з 20-га па 31-га верасьня на зяблева працавала **толькі 36 проц. трактараў.**

Прыстасаваньне плугоў іншых канструкцый давала магчымасьць павялічыць колькасьць трактараў на зяблевым ворыве. Але аб гэтым, пачынаючы з загадчыка эксплёатацыяй трактараў тав. Брунава і канчаючы дырэкцыяй, ніхто не падумаў. Толькі цяпер, калі зяблевае ворыва стаіць пад пагрозай зрыву, выявілася, што можна скарыстаць 4 плугі Адэскага заводу на некаторых вучастках балота.

Задача дырэкцыі саўгасу і партыйна-савецкіх арганізацый. — у бліжэйшыя дні дабіцца ліквідацыі прарыву, мабілізаваўшы наяўны прычэпны інвэнтар, перакінуўшы на зяблева максымальную колькасьць трактараў.

М.

„Калгасы заняты на іншых работах"

КРУПКІ. Адсутнасьць аперацыйнага кіраўніцтва зяблевым, апартуністычная недаацэнка гэтай важнейшай кампаніі прывяла да таго, што плян на 20 кастрычніка па раёне выканан толькі на 13,7 проц. **Аднаасобнікі пяці сельсаветаў Абчугскага, Шынкоўскага, Хацюхоўскага, Грыцькаўскага, Бабрыскінскага на сёньняшні дзень яшчэ не прыступілі да зяблева.**

Апартуністы з райкалгассаюзу тлумачаць слабыя тэмпы зяблева на калгасах тым, што... «калгасы заняты на іншых работах».

Неабходна ўжыць рашучыя меры. Апартуністы, пінаватыя ў зрыве зяблева, павінны быць прыцягнуты да адказнасьці. Раённыя арганізацыі абавязаны забясьпечыць круты пералом.

КАЗІМІРАЎ.

Случчына не перакінула цягі на ворыва

СЛУЦАК.

Плян зяблева па Случчыне выканан толькі на 25 проц. Рад калгасаў грубо ігнаруе дырэктывы аб перакідцы цягі на зяблева 60 проц. жывой цягавай сілы. Калгасы «Чырвоны працаўнік», «Парыская камуна», «Камбайн» яшчэ не перакідчылі на зяблева і 30 проц. коняй.

Сельсаветы ў большасьці выпадкаў дасталі на чале барацьбы за пасьпяховае выкананьне пляну зяблева. Такія сельсаветы, як Трошчыцкі, Ленінскі і інш., паваг не адвялі аднаасобнікам плошчы пад зяблева. У выніку аднаасобнікі зяблева наваг не пачынаді.

Райкалгассаюз на прыняў захадаў для таго, каб забясьпечыць выкананьне плянавага заданьня ў сацыялістычным сэктары раёну. Большасьць калгасаў раёну не ўзялі яшчэ бальшавіцкіх тэмпаў. Калгас «Камбайн» выканаў плян зяблева толькі на 27 проц., «Карла Маркса» — на 10 проц. Партыйныя і камсамольскія ячэйкі па месцах не разгарнулі масавай работы.

Каб дабіцца пералому, трэба мабілізаваць на зяблева максымум цягавай сілы, разгарнуць сапраўды бальшавіцкую масавую работу вакол зяблева.

Я. ЖЫЛКА.

175.000 ТОН БУЛЬБЫ—ЛЕНІНГРАДУ

НЯ МЕНШ 9.500 ТОН

адгружаць штодзенна

„ПЕРАКЛЮЧЫЦЬ УСЕ РАЁНЫ НА ВЫВАЗ БУЛЬБЫ ДЛЯ ЛЕНІНГРАДУ, СПЫНІЎШЫ ЎСЯКІЯ ПЕРАВОЗКІ БУЛЬБЫ ПА ЧЫГУНЦЫ ДЛЯ МЯСЦОВЫХ ПАТРЭБ З ТЫМ, КАБ ПОЎНАСЬЦЮ ВЫКАНАЦЬ ПЛЯН ВЫВАЗУ НЕ ПАЗЬНЕЙ ЯК ДА 1-ГА ЛІСТАПАДА Г. Г." (З ПАСТАНОВЫ ЦК КП(б)Б)

Полацак перавыканаў плян адгрузкі

ПОЛАЦАК.

ПОЛАЦКІЯ РАЁННЫЯ АРГАНІЗАЦЫІ ПА-ЎДАРНАМУ ЎКЛЮЧЫЛІСЯ Ў КАМПАНІЮ ПА АДГРУЗЦЫ БУЛЬБЫ ЛЕНІНГРАДУ. ЗА АПОШНІ ЧАС АМАЛЬ КОЖНЫ ДЗЕНЬ СА СТАНЦЫІ ПОЛАЦАК АДПРАЎЛЯЛІСЯ ЧЫРВОНЫЯ ЭШАЛЁНЫ З БУЛЬБАЙ ДЛЯ ПРАЛЕТАРАЎ ЛЕНІНГРАДУ.

НА 19 КАСТРЫЧНІКА ПЛЯН АДГРУЗКІ БУЛЬБЫ ЛЕНІНГРАДУ ПЕРАВЫКАНАН НА 4 ВАГОНЫ.

А. ШУСТРЫ.

ХОД АДГРУЗКІ БУЛЬБЫ ЛЕНІНГРАДУ

(У ТОНАХ)

21 кастрычніка	22 кастрычніка	23 кастрычніка	24 кастрычніка	25 кастрычніка
4.984	3.526	2.720	2.975	2.774

3 вагоны замест 17

Камсамол—у баку ад загатоўкі і адгрузкі

РАГАЧОЎ. (Наш кар.). Адгрузка бульбы пралетарскім цэнтрам разгортваецца недапушчальна марудна. Рагачоўшчына павінна адгрузіць 6.333 тоны бульбы. Фактычна адгружана толькі 1.615 тон—25,5 проц. пляну. Замест 17 вагонаў штодзённа адпраўляецца 3-4. Такі марудны тэмп загатовак стварае ляўную пагрозу зрыву пляну сваячасовай адгрузкі бульбы.

Асноўныя загатоўцы — райкаапсаюз і райспажыўсаюз замест разгортваньня загатовак і адгрузкі бульбы займаюцца канкуренцыяй, чым створаюць ажыятаж, які перашкаджае бульбазагатоўкам.

Старшыня райкаапсаюзу тав. Фарбэраў загадаў сваім работнікам пераглядаць чырвоныя абозы яшчэ на дарозе, незалежна ад таго, хто гэтыя абозы арганізоўваў, і падвозіць іх да станцыі ад імя каапсаюзу. Між тым апарат каапсаюзу зусім не мабілізаваны на разгортваньне бульбазагатовак і адгрузку бульбы.

Райспажыўсаюз дагэтуль не наладзіў кантролю за выкананьнем цьвёрдых заданьняў кулацка-заможнымі гаспадаркамі, і лічыць, што гэта справа толькі парт'ячэек і сельсаветаў.

Грамадзкасьць раёну зусім не згуртавана вакол загатоўкі і адгрузкі бульбы. Камсамол стаіць у баку ад гэтай важнейшай гаспадарча-палітычнай кампаніі. Камісіі самадзейнасьці амаль ва ўсіх сельсаветах бязьдзейнічаюць.

У ходзе загатоўкі і адгрузкі бульбы ў бліжэйшыя-жа дні трэба дабіцца карэннага пералому. Да 1 лістапада плян адгрузкі бульбы павінен быць выканан поўнасьцю.

САЛАДУХІН.

Патроіць тэмпы

СТАРЫЯ ДАРОГІ.

Сыстэма Старадароскага райкаапсаюзу павінна адгрузіць Ленінграду 400 тон бульбы. На 21 кастрычніка адгружана толькі 176 тон, або 44 проц.

Такімі-як марудным тэмпамі працуе і сыстэма **райспажыўсаюзу**, якая з заданьня ў 400 тон адгрузіла толькі 225 тон. Агульны плян адгрузкі па раёне выканан на 50,1 проц.

Трэба неадкладна ўзмацніць тэмпы адгрузкі. Загатоўчыя арганізацыі павінны зараз-жа мабілізаваць увесь свой апарат на поўнае і сваячасовае выкананьне пляну. Кіруючыя раённыя арганізацыі абавязаны забясьпечыць жывое сыстэматычнае кіраўніцтва кампаніяй. Вінаватыя ў злачынным зрыве адгрузкі павінны быць прыцягнуты да адказнасьці.

М. МАЦКО. П. ХАРЫТАНОВІЧ.

„Адгрузка бульбы—не мая справа"

ХОЙНІКІ.

Каб сваячасова і поўнасьцю выканаць плян адгрузкі бульбы Ленінграду, Хойніцкі раён ПАВІНЕН АДГРУЖАЦЬ ШТОДЗЕННА НЯ МЕНШ 8-мі ВАГОНАЎ. АДГРУЖАЮЦЦА-Ж ТОЛЬКІ 2-3 ВАГОНЫ Ў ДЗЕНЬ. Гэтыя недапушчальна марудныя тэмпы зьяўляюцца вынікам бязьдзейнасьці сыстэм райкаапсаюзу і райспажыўсаюзу. Кіраўніцтва гэтых сыстэм не аддае належнай увагі адгрузцы. Старшыня райспажыўсаюзу тав. БЛЮМКІН заяўляе:

— Адгрузка бульбы ня наша справа, на гэта ёсьць райзаг.

Зразумела, што пры такіх злачынных адносінах з боку адказных работнікаў загатоўчых арганізацый нельга забясьпечыць высокія тэмпы адгрузкі.

Пасобныя сельсаветы да гэтага часу зусім ня ўключыліся ў вывазку бульбы. Так, МАКЕНАВІЦКІ сельсавет не адгрузіў яшчэ ні аднаго вагону бульбы.

Цьвёрдыя заданьні з кулацка-заможных гаспадарак па здачы бульбы не спаганяюцца. Пад носам у сельсаветаў кулакі разбазарваюць бульбу, злосна сабатуюць загатоўкі.

Да гэтага часу загатоўшчыкі ня маюць яшчэ дакладных сьпісаў кулацка-заможных гаспадарак і пляну паступленьня бульбы па цьвёрдых заданьнях.

РК КП(б)Б і РВК павінны зараз-жа дабіцца рашучага эруху ў ходзе загатовак і адгрузцы бульбы. Трэба мацней ўдарыць па апартуністычнай недаацэнцы кампаніі з боку сельсаветаў і загатоўчых органаў. Да 1 лістапада плян адгрузкі бульбы пралетарам Ленінграду павінен быць поўнасьцю выканан.

Г.

ЗАКАТ КЛЯСЫЧНАЙ „ДЭМАКРАТЫІ"

Сёньня адбываюцца выбары ў ангельскі парлямант.

Англія была краінай клясычнага парлямантарызму, калыскай сучаснай буржуазнай «дэмакратыі». Але яшчэ ніколі гэта «старэйшая ў сьвеце дэмакратыя» не мітусілася ў ліхаманцы так, як пры сучасных ўсеагульных выбарах.

«Найбольш крытычныя і найбольш сур'ёзныя ў гісторыі Англіі» — так заявіў лёрд Грэй пакоп гэтых выбараў. І сапраўды, у крытычны момант для Брытанскай імпэрыі адбываюцца выбары 27-га кастрычніка.

Сусьветны эканамічны крызіс, які адбываецца на падставе ўсеагульнага пасьляваеннага крызісу капіталізму, канчаткова падтачыў магутнасьць брытанскага ільва.

Векавыя падваліны імпэрыі яго вялікасьці ангельскага караля — гэта фунт і флёт. І яны за апошнія два месяцы заламаліся. Пад уплывам рэвалюцыйнай вуліцы, пад уплывам прабуджэньня рабочай клясы Англіі былі выкліканы хваляваньні і мяцеж у ангельскім вайсковым флёце. Чаго-небудзь падобнага ніхто ў Англіі раней сабе і прадставіць ня мог. Флёт—гэтая апора імпэрыялізму—павёў барацьбу супроць ураду. Другая апора імпэрыі — фунт стэрлінгаў—сусьветная валюта, якая дала Англіі ключы да сусьветнага панаваньня—панярпеў банкроцтва.

У ангельскіх калёніях і дамініёнах узьнімаецца нацыянальна-вызваленчая барацьба. Ангельскаму ўраду становіцца ўсё больш цяжка трымаць у ціскох калёніі. Перла ангельскай імпэрыі—Індыя—ахоплена магутным рэвалюцыйным рухам.

Закон пяроўнамернасьці разьвіцьця капіталізму дзейнічае зараз у часе эканамічнага крызісу з асаблівай сілай. Англія за апошнія месяцы ўступіла свае месца гегемона ў Эўропе Францыі і пад націскам крызісу прымушана ісьці на новыя ўступкі.

Ужо зараз клясавая барацьба ў Англіі рэзка абвострылася. На вуліцах буйнейшых цэнтраў адбываюцца, пад кіраўніцтвам кампартыі, грандыёзныя дэманстрацыі, якія заканчваюцца сутычкамі з паліцыяй і арыштамі.

Пасьля двухгадовага прабываньня лейбарыстаў ва ўладзе, рабочыя масы пераконваюцца, што так званы **«рабочы» ўрад ня горш цьвёрдалобых Бальдвінаў і Чэрчыляў абараняе інтарэсы капіталістаў.** Стыхійныя забастоўкі гарнякоў Паўднёвага Уэльса пэрсьцянікаў Брэтфорда былі задушаны пры простым падтрыманьні лейбарысцкага ўраду.

Праводзіць далейшае рабаваньне мас рабочых рукамі лейбарыстаў стала менш зручным і зьвязана з вялікай рызыкай. Каб адвесьці нездавальненьне мас у бясьпечны канал па меры магчымасьці, не дапускаць камуністычную партыю да кіраўніцтва барацьбой шырокіх пластоў рабочых, ангельская буржуазія зрабіла новы манэўр: лейбарысты былі зноў пераведзены на ролю «апазыцыі» і «абаронцаў» інтарэсаў рабочых. У гэтым і заключаецца сэнс стварэньня «нацыянальнага» блёку і назначэньня ўсеагульных выбараў.

Сучасная выбарная кампанія прадстаўляе сабой поўную кашу партый і груповак. Калі на працягу стагодзьдзяў барацьба за голас выбаршчыка адбывалася паміж дзьвюма партыямі, а за апошняе дзесяцігодзьдзе паміж трыма асноўнымі партыямі (кансэрватары, лібералы і лейбарысты), дык зараз прадвыбарчую кампанію разгарнулі **8 розных партый і груп.**

Асабліва характэрны і яскравы малюнак крызісу і разлажэньня ангельскага рэфармізму. Замест адзінай лейбарысцкай партыі, зараз на выбарах выступаюць чатыры канкуруючыя паміж сабою групы: нацыянал-лейбарыстаў на чале з Макдональдам, проста лейбарыстаў— з Гендэрсонам, «новай партыі» — з Мосьлі (фашысцкая) і, нарэшце, «левых» — групы Мэкстона. Замест лібэральнай партыі зараз выступаюць тры групы, якія разам узятыя выставілі **на 353 кандыдатуры менш,** чым выставіла ўся лібэральная партыя на мінулых выбарах.

Але гэты лябірынт партыйных пляц форм і палітычных груповак ня можа захаваць таго асноўнага факту, што па парляманцкіх выбарах у Англіі ўся го выступае толькі **два варожых адзін аднаму лягерэў.** Яны адрозьніваюцца не па адзнацы за ці супроць «нацыянальнага» ўраду. У сапраўднасьці і нацыянальны блёк і новая «апазыцыя яго вялікасьці» — лейбарысцкая партыя знаходзіцца ў адным лягеры, у якім адбылася толькі перагрупоўка сіл, якая адпавядае новым задачам барацьбы за захаваньне ўлады буржуазіі.

Адзіным супраціўнікам «нацыянальнага» ўраду, як і любога іншага ўраду буржуазіі, зьяўляецца **толькі камуністычная партыя.** Яна заклікае ангельскіх пралетараў да барацьбы за рэвалюцыйны выхад з крызісу і паказвае ім ясную праграму дзеяньняў. У цяперашніх умовах нябывалага паглыбленьня эканамічнага крызісу, усеагульнага наступленьня на зарплату, абвастрэньня клясавай барацьбы, пашырэньня працэсу паляўвеньня шырокіх мас працоўных — парляманцкія выбары, бязумоўна, пакажуць рост уплыву кампартыі і паслужаць штуршком для ператварэньня яе ў масавую партыю ангельскага пралетарыяту.

Ангельская кампартыя выкрывае **новы падзел працы ў лягеры буржуазіі і заклікае масы выступаць адзіным фронтам супроць капіталістаў і іх верных служак** — Гендэрсонаў, Макдональдаў і Мэкстонаў да барацьбы за зьвяржэньне ангельскага капіталізму, за стварэньне **Савецкай Англіі.**

Рэдакцыі газэт „Зьвязда", „Вечерняя Москва" скліканюць на 27 кастрычніка а 7 гадзіне ўвечары ў КЛЮБЕ ДРУКАРОЎ (Ленінская, 13)

МАСАВЫ СХОД

членаў радкалегій выдаткаваньняў і насьцягазэт прадпрыемстваў і ўстаноў, рабкораў і рабочых гор. Менску,

ПРЫСЬВЕЧАНЫ

абмену сацыялістычным вопытам Менску і Масквы.

НА ПАРАДКУ ДНЯ:

1. Выступленьне сакратара ЦК КП(б)Б тав. Шаранговіча.
2. Выступленьне вызнога рэдактара „Вечерней Москвы" т. Сэйфі.
3. Даклад НК Камунальнай гаспадаркі.
4. Мастацкая частка.

Білеты рассылаюцца па прадпрыемствах.

ДРОВЫ—МЕНСКУ

Лесрабкопы павінны стаць ударнымі цэхамі загатовак

Зараз у Менску адбываецца зьезд старшынь лесрабкопаў. Дэлегаты нарады сабраліся адтуль, дзе ідзе барацьба за апал,—з лясных гушчаў.

Дэлегаты зьезду прыехалі для таго, каб абгаварыць недахопы, каб агульна абмеркаваць меры, якія трэба прыняць для ліквідацыі прарываў ў лесазагатоўках.

Аднэй з асноўных прычын недавыкананьня пляну лесазагатовак зьяўляецца невыстарчальнае матар'яльнае забесьпячэньне рабочых. Аб гэтым гаварылі амаль усе выступаўшыя.

Лесазагатоўкі забясьпечаны сталоўна мі толькі на 50 проц. патрэбнай колькасьці. Пабудова сталовак праходзіць вельмі марудна; не хапае цьвікоў, абстаўляньня, катлоў і НАВАТ ЛЫЖАК І ВІДЭЛЬЦАЎ. Якасьць абедаў дрэнная.

Лесрабкопы і леспрамгасы не прынялі належных мер да поўнага забесьпячэньня лесарубаў прадуктамі. У радзе раёнаў не хапае цукру, масла, рыбы. Яшчэ горшае становішча з прамтаварамі. Ёсьць выпадкі, калі, з прычыны дрэннай работы лесрабкопаў, не хапае нават запалкаў.

Дастаўка прадуктаў больш чым нездавальняючая. З Рэчыцы паведамляюць, што па хлеб прыходзіцца ехаць за 50 клм. і часта вярочацца з пустымі вазамі. Нярэдка замест хлеба выдаецца жыта або авёс.

Тавар у раёны лесазагатовак дастаўляецца ў вельмі дрэнным выглядзе; скрынкі пабітыя і няпоўныя. Ёсьць выпадкі, калі на нарадах, выданных лесрабкопам, тавары не атрымліваюцца.

Такое становішча забесьпячэньня рабочых прамтаварамі і харчамі зьяўляецца аднэй з прычын цякучасьці рабсілы на лесазагатоўках.

Дэлегаты зьезду адзначалі недапушчальную бязьдзейнасьць прафэсыянальных арганізацый, якія ня цікавяцца пытаньнямі паляпшэньня харчаваньня рабочых, забесьпячэньня іх патрэбнымі прамтаварамі.

Прадстаўнік аддзелу снабжэньня ляснай сэкцыі тав. Клёнскі лічыць, што прадуктаў для лесазагатовак было адпушчана ў выстарчальнай колькасьці, але яны часта скарыстоўваюцца не па прыналежнасьці.

«Мы стаім перад прарывам,—кажа тав. Клёнскі,—з прычыны таго, што прафарганізацыі саюзу лесдрэўрабочых не пэвярнуліся тварам да вытворчасьці, што лесрабкопы не адчуваюць слабе цэхам, адкаеным за выкананьне пляну. У лесрабкопах часта панове бескантроль насьць, адсутнічае ўлік. Таму ня дзіва, што тавары, якія ідуць у лесрабкоп, разьмяркоўваюцца не па прызначэньні. Прэміяваньне ўдарнікаў у большасьці раёнаў не праводзіцца. Фонды прамтавараў для прэміяваньня не скарыстаны

У лесрабкопах адчуваецца недахват у людзях. Шмат работнікаў накіравана з цэнтру, але чамусьці на месцы ў рабкопы яны не даехалі.

Дэлегаты нарады ў сваіх прамовах адзначалі неабходнасьць хутчэйшага пераводу ўсёй работы на гаспадарчы разрахунак. Неабходна дабіцца выразнасьці і дагаворанасьці ў рабоце паміж леспрамгасамі, лесасэкцыямі і лесрабкопамі.

Пляны лесазагатовак зусім рэальныя, пры адпаведнай рабоце ўсіх зьвеньняў лесазагатоўчай сыстэмы, у тым ліку аднаго з важнейшых цэхаў лесрабкопаў—могуць быць і будуць поўнасьцю выкананы.

Чыгунка затрымлівае адгрузку

ПЯТРЫКОЎ. (Па тэлеграфу).

На станцыях Пятрыкоўскага леспрамгасу ляжаць непагружанымі 200 вагонаў дроў Леспрамгас штодзенна дае заяўкі чыгунцы на 50 вагонаў, але гэтыя заяўкі не здавальняюцца. Адгрузка дроў спынена.

* * *

СТАРОБІН. (Па тэлеграфу).

Старобінскі леспрамгас штодзенна павінен адгружаць са станцыі Старушкі 30 вагонаў дроў для Менску. Вагоны чыгункай не падаюцца. У выніку на станцыі ёсьць залежы дроў каля 200 вагонаў.

Глускі раён здае тэмпы

Глускі раён у свой час быў прэміяваны за лепшае выкананьне пляну вывазкі дроў для забесьпячэньня Менску. За апошні час, з пачатку чацвертага кварталу, Глускі раён здаў тэмпы загатовак і адгрузкі дроў.

На працягу кастрычніка раён павінен быў адгрузіць 300 вагонаў. На 15-га кастрычніка адгружана ўсяго 79 вагонаў. Ня лепш праходзіць падвоз дроў да чыгуначных станцый.

Дрэнны ход адгрузкі і загатовак тлумачыцца слабым кіраўніцтвам гэтай справай з боку райкому КП(б)Б. Райком лічыць, што патрэбна «чарговасьць кампаніі: «раней адгрузім бульбу, а потым возьмемся за дровы».

Да гэтага часу да леспрамгасаў не прымацаваны поўныя сельсаветы, якія адказвалі-б за вывазку дроў. Сёньня прымацоўваецца адзін з сельсаветаў, а пазаўтра РВК алмаоўвае яго.

Раённыя арганізацыі павінны пераключыцца на поўнае выкананьне пляну вывазкі дроў для забесьпячэньня Менску апалам.

Глускі.

„НІ АДНАГО ЦЭНТНЭРА ЗБОЖЖЯ ПРЫВАТНІКУ“

ІНТАРЭСЫ ПРАЛЕТАРСКАЙ ДЗЯРЖАВЫ—У ПЕРШУЮ ЧАРГУ

Бязьлітасным змаганьнем з кулацкімі, месьніцкімі, спажывецкімі тэндэнцыямі, апіраючыся на калгасы, па-бальшавіцку мабілізуючы шырокія масы калгасьнікаў і аднаасобнікаў, даб'емся выкананьня і перавыкананьня пляну збожжазагатовак

„На ўмацаваньне кармовай базы для разгортваньня жывёлагадоўлі павінны быць мабілізаваны ў першую чаргу ўсе ўнутраныя рэсурсы калгасаў і саўгасаў і браніяваньне кармовых фондаў можа ўтварацца толькі звыш пляну загатовак і ні ў якім выпадку не за лік іх скарачэньня“ (З пастановы ЦК КП(б)Б)

Рашуча пакончыць з расхлябанасьцю, хаосам і блытанінай ва ўліку загатовак

Ударная задача

На 20 кастрычніка плян збожжазагатовак выкананы толькі на 35,4 проц., па бульбе на 20 проц. Гэтым паказальнікі сьведчаць аб тым, што тэмпы, якія ўзяты ў радзе раёнаў у справе загатовак, не забясьпечваюць своечасовага і поўнага выкананьня гадавога загатоўчага пляну.

Такое становішча з выкананьнем пляну загатовак сьпрыяцца вынікам таго, што ў радзе раёнаў партыйныя і савецкія арганізацыі недаацанілі сыстематычнай масавай работы сярод калгасьнікаў, беднякоў і сераднякоў—аднаасобнікаў па арганізацыі загатовак, не арганізавалі рашучага націску на кулака і заможніка, якія, карыстаючыся апартуністычнай бязьдзейнасьцю раду кіраўнікоў партыйных ячэек сельпартыкомаў і сельсаветаў, злосна ня выконвалі даведзеных ім цьвёрдых заданьняў, разбазарвалі свае прадукты.

Гэтым самым кіраўнікі некаторых раённых партыйных і савецкіх арганізацый «па сутнасьці зьявіліся агентамі кулака ў партыйным, савецкім і калгасным апараце». ЦК КП(б)Б моцна ударыў па агентах клясавага ворага. Рад раённых раённых прааўнікоў зьняты з работы і атрымалі суровыя партыйныя спагнаньні.

25 кастрычніка сакратарыят ЦК КП(б)Б заслухаў даклады аб ходзе загатовак Бабруйскага, Слуцкага, Клімавіцкага і Гарадецкага райкомаў партыі.

Даклады, ілюстраваныя фактамі, паказваюць на тое, што ў гэтых раёнах партыйныя арганізацыі **невыстарчальна падрыхтаваліся да правядзеньня збожжазагатовак.** Некаторыя партарганізацыі не зразумелі таго, што ў новых умовах павялічэньне адноснай вагі ў загатоўках сацыялістычнага сэктару) арганізацыі загатовак, правядзеньне палітычна-масавай работы на вёсцы адыгрываюць вялізнае значэньне. Забываючы аб тым, што ў калгасах ляжыць асьць палуасьць дробна-буржуазных тэндэнцый самаабясьпячэньня, гэтыя партарганізацыі узялі стаўку на самацёк. У выніку — на некаторых раёнах калгасны сэктар у справе загатовак значна адстае. У той час, калі аднаасобнікі Гарадоцкага раёну выканалі плян бульбазагатовак на 91,5 проц., калгасьнікі гэтага раёну выканалі плян толькі на 54 проц.

У радзе калгасаў **Койданаўскага** раёну мела месца ўтойванне насеўнай плошчы. У **Гарадоцкім** раёне некаторыя калгасы пры вызначэньні ўраджайнасьці паказалі значна зьменшаныя лічбы. Між тым кіраўнікі мясцовых партыйных арганізацый, а таксама райкалгассаюзы гэтых раёнаў не рэагавалі на падобныя зьявішчы.

У калгасах Гарадоцкага раёну палічваецца звыш 130 заможнікаў, якія нават у радзе выпадкаў займаюць кіруючыя адказныя пасады. Такое-ж становішча мае месца ў **Клімавіцкім** і інш. раёнах. Усё гэта бязумоўна адбіваецца на выкананьні загатоўчых пляноў. У калгасе **«Полымя»** (Клімавіцкі раён) пасаду кладаўшчыка займаў заможнік, які самавольна павысіў нормы выдачы прадуктаў калгасьнікам у часе размеркаваньня ўраджаю і гэтым самым сарваў выкананьне пляну загатовак.

Спагнаньне цьвёрдых заданьняў з кулацка-заможных гаспадарак у радзе раёнаў праходзіць **недапушчальна марудна.** У паасобных сельсаветах партыйныя арганізацыі праяўляюць поўную бязьдзейнасьць у адносінах да кулака і заможніка, якія ня выконваюць цьвёрдых заданьняў. У пяці сельсаветах **Брагінскага раёну** ягнё да гэтага часу не даведзены цьвёрдыя заданьні да кулацка-заможных гаспадарак. У гэтым-жа раёне кулацка-заможныя гаспадаркі да гэтага часу не здалі ні аднаго кілёграма ільнавалакна. Ня лепш стаіць справа з выкананьнем цьвёрдых заданьняў па Клімавіцкім і Гарадоцкім раёнах.

Усё гэта сьведчыць аб тым, што ў радзе месц партыйныя арганізацыі аслабілі націск на кулака і заможніка, далі яму магчымасьць разбазарваць свае прадукты.

Такія-жа факты мелі месца ў паасобных цэнтральных арганізацыях. Цэнтралам зьвялілася Сельгасаб'яднаньне Белкаапсаюзу, кіраўніцтва якога дало сваім саўгасам апартуністычную ўстаноўку на асяданьне бульбы ў самых прыгарадных гаспадарках. Замест таго, каб мабілізаваць саўгасы на поўную і даўгарміновую здачу бульбы дзяржаве, на своечасовае выкананьне абавязкаў перад прамысловымі цэнтрамі, дырэкцыя Сельгасаб'яднаньня дала антыпартыйную, шкодную дырэктыву, якая арыентавала саўгасы на самазабясьпячэньне і прыняла да ганебнага прарыву па ўборцы і здачы бульбы калгасамі.

Вопыт перадавых раёнаў, сельсаветаў і калгасаў, якія з посьпехам выконваюць загатоўчыя пляны, паносіць руйнуючы ўдар на апартуністах, якія не перастаюць спасылацца на нерэальнасьць пляноў, штучна зьмяншаючы паказальнікі ўраджайнасьці і пасеўнай плошчы. Сёньня мы друкуем матар'ялы аб тым, што ў **Кісьцянеўскім, Старасельскім, Забалоцкім** і інш. сельсаветах Рагачоўскага раёну квартальны плян збожжазагатовак значна перавыкананы. Гэтыя посьпехі зьяўляюцца вынікам таго, што партыйныя арганізацыі гэтых сельсаветаў штодзённа арганізоўвалі і апэрацыйна кіравалі загатоўчай кампаніяй, стварылі належную грамадзкую думку сярод калгасьнікаў, бядняцка-серадняцкіх мас вакол выкананьня загатовак.

Узмацніць націск на кулака, прымусіць яго здаць поўнасьцю і своечасова цьвёрдыя заданьні, мацней агонь па апартуністах, якія натураюць рвацкім і спажывецкім настроям! Тыя, хто пад відам стварэньня рознастайных фондаў зрываюць пляны загатовак павінны быць прыцягнуты да суровай адказнасьці. Разам з гэтым партыйныя арганізацыі павінны памятаць аб тым, што важнейшай умовай пасьпяховага выкананьня загатоўчых пляноў зьяўляецца штодзённая сыстематычная растлумачальная **масавая работа як сярод калгасьнікаў,** так і беднякоў і сераднякоў—аднаасобнікаў.

З мэтай стымуляваньня загатовак райкалгассаюзы і кіраўніцтва МТС павінны разгарнуць работу па прэміраваньні тых калгасаў, якія выканалі або набліжаюцца да поўнага выкананьня пляну загатовак. Пры дапамозе раённага і цэнтральнага друку, шляхам стварэньня спэцыяльных брыгад з калгасьнікаў перадавых калгасаў, раённыя партарганізацыі павінны папулярызаваць вопыт работы тых сельсаветаў і калгасаў, дзе пляны загатовак выконваюцца і перавыконваюцца.

К—р.

РВАЦКІЯ, МЕСЬНІЦКІЯ ТЭНДЭНЦЫІ СЕЛЬГАСАБ'ЯДНАНЬНЯ

сарвалі здачу бульбы каапгасамі

Сельгасаб'яднаньне, якое ўваходзіць у сыстэму Белкаапсаюзу, шляхам разгортваньня прыгарадных гаспадарак, на вённа забясьпечваць прамысловыя цэнтры БССР гародзінай і бульбай.

Паводле пляну ЭКАСА **Сельгасаб'яднаньне павінна здаць** закрытым рабочым размеркавальнікам 40 тыс. тон гародніны, з якіх **бульбы — 13 тыс.** тон. Усяго каапгасы маюць сабраць 18.000 тон бульбы.

На 20-га кастрычніка. Убрана 10.422 тоны, з якіх у **ЗРК здана толькі 4.935 тон.**

Чым тлумачыцца такая **марудная** ўборка і здача бульбы?

Тым, што **Сельгасаб'яднаньне ўзяло курс на самазабясьпячэньне,** тым, што **бульба асядае ў саміх прыгарадных гаспадарках. Дырэкцыя** недаацаніла палітычнай важнасьці забясьпячэньня ў першую чаргу рабочых прамысловых цэнтраў, яна **праявіла яўна рвацкія, месьніцкія тэндэнцыі.** Аб гэтым гавораць факты.

Тыдзень назад дырэктар Сельгасаб'яднаньня тав. **Вайцэховіч** паслаў усім каапгасам наступную дырэктыву:

«Зараз-жа ўстанавіць, якая колькасьць бульбы і гародніны патрабуецца для сталовак каапгасаў на ўсю зіму і вясну. Пры гэтым падлікак улічваць поўнае забясьпячэньне ня толькі на сучасную колькасьць абедаючых, але і на ўвесь намечаны ўзрост рабсілы. Вылучыць і захаваць спэцыяльна для сталовак ўсю патрэбную колькасьць бульбы і гародніны з сабранага каапгасамі ўраджаю».

У выніку такой дырэктывы **на месцах пачалі ствараць розныя перапавярэчныя фонды,** у першую чаргу для мясцовых сталовак і інш. **Асноўная задача каапгаспадарак — забясьпечыць рабочых прамысловых цэнтраў — была адсунута на задні плян.** У даным выпадку мы маем такія-ж шкодныя, спажывецкія тэндэнцыі, якія намі былі ўскрыты ў **Белсаўгастрэсьце, г. зн.** «спачатку забясьпечыць сябе, а потым ужо думаць аб пралетарскай дзяржаве», аб інтарэсах гарадзкіх рабочых.

Дырэкцыя Сельгасаб'яднаньня прадстаўляе таксама саўгасам вялікую ініцыятыву ва ўстанаўленьні розных **надбавачных** норм для ўнутрысаўгасных затрабаў. Гэта выклікае яшчэ большае асяданьне таварнай бульбы ў каапгасах.

Палітычна-шкодныя дырэктывы Сельгасаб'яднаньня скарыстоўваюцца клясавым ворагам для напырэньня сваіх рвацкіх, кулацкіх тэндэнцый у каапгасах.

Некаторыя дырэктары каапгасаў пайшлі па шляху самавольнага **разбазараньня** таварнай прадукцыі. Так, **дырэктар каапгасу «Новы сьвет» раздае бульбу направа і налева.** Ён выдаў, напрыклад, для ўласных патрэб загатоўку мармэляднага заводу Чуйко 1.000 кілр. бульбы. Саўчыку і Левашка (работнікі міліцыі) — па 650 кілр., Байко і Павукову (работнікі Белкаапсаюзу) — па 480 кілр., Бандарынай, Лаўрашцу і Бандарэнка (таксама работнікі Белкаапсаюзу) — па 620 кілр. і г. д. Тав. Вайцэховіч недаў аб злоўжываньнях дырэктара саўгасу «Новы сьвет», але-ж ніякіх мер ня ўжыў. Гэтым самым ён фактычна санкцыянаваў злачынныя ўчынкі дырэктара каапгасу.

Шкодныя дырэктывы Сельгасаб'яднаньня, у якіх даецца месьніцкая, рвацкая **ўстаноўка** на самазабясьпячэньне і якія фактычна зрываюць выкананьне каапгасамі сваіх абавязацельстваў перад дзяржавай, **павінны быць неадкладна скасаваны.** Увага рабочых мас каапгасаў павінна быць завострана на палітычнай сутнасьці гэтых месьніцкіх установак. Трэба мабілізаваць рабочую масу каапгасаў на самую рашучую барацьбу з усялякімі праявамі кулацкіх, спажывецкіх тэндэнцый — спачатку забясьпечыць сябе, а потым ужо думаць аб выкананьні абавязацельстваў перад пралетарскай дзяржавай.

Калгаспрацыйныя гаспадаркі павінны неадкладна ліквідаваць прарыў, у самы кароткі тэрмін здаць сваю таварную прадукцыю і паказаць узор бальшавіцкай барацьбы за своечасовае і поўнае выкананьне сваіх абавязацельстваў.

Вінаватыя ў скажэньні дырэктыў пар тыі, апартуністы, якія сваімі шкодным антыпартыйнымі дырэктывамі і ўстаноўкамі стварылі прарыў ва ўборцы і здачы бульбы каапгасамі, павінны быць прыцягнуты да самай суровай адказнасьці.

В.

Здача збожжа аднаасобнікамі

Біць па кулацкіх агентах--зрыўшчыках загатовак

Гадавы плян збожжазагатовак па **Рагачоўскім раёне** на 20 кастрычніка быў выканан толькі на 37,3 проц. Такі недапушчальна марудны ход збожжазагатовак тлумачыцца тым, што рад партыйных ячэек і сельпарткомаў раёну ў справе загатовак узялі стаўку на самацёк. Асабліва адставаньне назіраецца ў **Збароўскім сельсавеце,** дзе на 20 кастрычніка плян збожжазагатовак быў выкананы толькі **на 5 проц.** Ня лепш стаіць справа ў **Станькаўскім, Гадзілавіцкім, Маластралкоўскім, Азеранскім і Курганскім** сельсаветах, дзе процант выкананьня гадавога пляну збожжазагатовак **не перавышае 20-25 проц.**

Апошняя дэкада паказала, што тэмпы загатовак ня толькі не павысіліся, а значна зьнізіліся. Калі з 10 па 15 кастрычніка было загатоўлена каля **7 проц.** гадавога пляну, то ў наступную ніядзіеўку ў загатоўчых пунктах паступіла толькі **5 проц.** пляну.

У памянёных сельсаветах партыйныя ячэйкі **ня ўжылі** належных мер у адносінах да кулацка-заможных гаспадарак, якія злосна сабатуюць выкананьне даведзеных да іх цьвёрдых заданьняў. На 20 кастрычніка па раёне кулацка-заможныя гаспадаркі выканалі цьвёрдыя заданьні **толькі на 52 проц., а ў некаторых** сельсаветах — значна менш.

Райкалгассаюз ня прымае ніякіх захадаў для таго, каб ліквідаваць адставаньне ў справе загатовак калгаснага сэктару. **У райкалгассаюзе пануюць месьніцкія настроі і апартуністычныя спасыланьні на нерэальнасьць загатоўчых пляноў.** Адсутнасьць належнай масавай работы ў калгасах, шкодная арыентацыя іх райкалгассаюзам на стваральнае браніяваньне фондаў прыводзіць да таго, што ў радзе калгасаў («Свабода», «Друць», імя Сталіна і інш.) адмаўляюцца ад здачы таварных кішкаў дзяржаве.

Зусім іншы малюнак мы назіраем у тых сельсаветах Рагачоўскага раёну, дзе партыйныя арганізацыі і сельсаветы зразумелі ўсю палітычную важнасьць загатоўчай кампаніі, дзе калгасьнікі і бядняцка-серадняцкія масы былі мабілізаваны на выкананьне загатоўчых пляноў. У **Кісьцянеўскім** сельсавеце яшчэ 20 кастрычніка плян збожжазагатовак быў выканан **на 90 проц.,** у **Старасельскім — 78 проц.,** у **Забалоцкім** і **Поблаўскім — на 71 проц.** І г. д. Аднак, ні раённы камітэт партыі, ні райкалгассаюз не перанесьлі вопыту гэтых перадавых сельсаветаў у адстаючыя саўгасы і калгасы.

Посьпехі Кісьцянеўскага, Старасельскага і іншых сельсаветаў, якія перавыканалі квартальнае заданьне па загатоўках, ушчэнт разьбіваюць апартуністычныя настроі некаторых асобных работнікаў райкалгассаюзу. Рагачоўская партарганізацыя павінна зараз-жа пераключыцца на ажыцьцяўленьне пастановы ЦК КП(б)Б аб загатоўках. Пляны загатовак павінны быць выкананы.

І. САЛАДУХІН.

Загатоўкам—правільны ўлік

Ня гледячы не неадназразовыя дырэктывы партыі і ўраду і шматлікія сыгналы друку, **загатоўчыя арганізацыі дагэтуль яшчэ нічога не зрабілі для арганізацыі правільнага, добра наладжанага ўліку,** не ўзьняві гэтай справы на ўзровень задач, вызначаных партыяй у галіне загатовак.

У сваёй апошняй пастанове аб ходзе загатовак ЦК КП(б)Б адзначыў «зусім недапушчальную расхлябанасьць у пастаноўцы ўліку загатовак, у прыватнасьці існаваньне абязьлічкі ва ўліку здаванага збожжа, і зьліваньне здаванай прадукцыі калгасьнікамі, як здачу індывідуальным сэктарам сельскай гаспадаркі».

Вяз выразна наладжанага ўліку нельга кіраваць загатоўкамі. Поўная недацэнка гэтай справы прывяла да таго, што ўлік знаходзіцца ў самым агідным становішчы. **Зводкі Саюзхлеба, Белкаапсаюзу, Белхлопбжывсаюзу і Наркамснабу зусім не адпавядаюць сапраўднаму становішчу загатовак.**

З пяціднёўкі ў пяціднёўку ў рэдакцыю паступаюць тэлеграмы, у якіх раёныя арганізацыі рашуча абвяргаюць даныя, паказаныя ў зводках Саюзхлеба і Наркамснабу аб ходзе збожжазагатовак. **Па Сеньненскім раёне,** напрыклад, на 1 кастрычніка было выканана 36 проц. гадавога пляну, на 5 кастрычніка — 40,5 проц., на 10 кастрычніка — 43,2 проц., а ў **зводках Саюзхлеба** паказана, на 1 кастрычніка — 6,9 проц., на 5 кастрычніка — 14,1 проц., на 10 кастрычніка — 14 проц.

Па Вушацкім раёне на 5 кастрычніка было загатоўлена 19,7 проц. гадавога пляну, а ў зводцы Саюзхлеба на 5 кастрычніка фігуравалі 9 проц., на 10 кастрычніка — 14,7 проц. Такіх фактаў вельмі многа.

Сыстэматычным і **«ўзаконеным» зьяўляецца рознабой** паміж данымі Саюзхлеба і зводкамі Белтрактарацэнтру аб ходзе збожжазагатовак на калгасах МТС. **Розьніца** ўвесь час складае **15-18 проц.** Гэтыя арганізацыі ніяк ня могуць дагаварыцца паміж сабой.

Даныя Саюзхлеба сыстэматычна разыходзяцца з весткамі Белкаапсаюзу. Даволі часта адны і тыя-ж раёны фігуруюць у зводках Саюзхлеба, **як перадавыя,** а па даных Белкаапсаюзу — **як адсталыя.**

Вынікам блытаніны служыць наступны факт. На 15 кастрычніка ў зводцы Саюзхлеба было паказана, што па гэтым раёне гадавы плян збожжазагатовак быў выканан на 68,3 проц., а ў зводцы на 20 кастрычніка фігуруе новая лічба... 62,7 проц. Атрымліваецца, што за пяціднёўку з 15 да 20 кастрычніка па Гарадоцкім раёне ня толькі ня было паступленьня збожжа, а наадварот — нават «адліў» на 5-6 проц.

Ва многіх раёнах **прыёмачныя пункты зусім ня цінаваюцца, ад каго паступае збожжа — ад калгасьнікаў ці ад аднаасобнікаў?** Вельмі часта прыёмшчыкі запісваюць збожжа, паступіўшае ад калгасьнікаў, на аднаасобны сэктар. У тых раёнах, дзе загатоўку вядзе сыстэма Белкаапсаюзу, здача збожжа калгасамі складае 15 проц. усёй паступіўшай прадукцыі, а там, дзе загатоўкі вядзе сыстэма Белсадсаюзу — 67 проц. Сыстэма Белкаапсаюзу, як правіла, ня ўлічвае здачы збожжа калгасьнікамі. Прыёмшчыкі нават ня пытаюцца ў сялян-здатчыкаў, ці зьяўляюцца яны калгасьнікамі, ці аднаасобнікамі. «Усё роўна, абы паступіла збожжа»,—так разважаюць прыёмшчыкі, галоўным чынам, з сыстэмы Белкаапсаюзу.

Гэта вынік палітычнай сьлепаты раду загатоўчых арганізацый і работнікаў, не разуменьня або пажаданьня разумець важнасьці ўліку прыёмкі тэй ці іншай сельска-гаспадарчай прадукцыі ў парадку загатовак па сэктарох.

Як-жа адносяцца загатоўчыя арганізацыі да нятьканьня палапшаньня ўліку загатовак? Паасобныя арганізацыі яўна сабатуюць выкананьне дырэктыў партыі аб уліку, зусім ня цікавяцца гэтым пытаньнем.

Гэта выразна выявілася на нарадзе, скліканай Наркамснабам БССР 24 кастрычніка. Некаторыя арганізацыі зусім ня прыслалі сваіх прадстаўнікоў на гэту нараду. Характэрны прыклад. Прадстаўнік Саюзхлеба тав. **Слабадкін** замест таго, каб выкрыць усе недахопы ў пастаноўцы ўліку, у сваім выступленьні на нарадзе імкнуўся запэўніць, што «ў Саюзхлебе з гэтай справай усё ў поўным парадку». І такое самахвальства і задаволенасьць выказвае прадстаўнік Саюзхлеба, дзе пастаноўка ўліку асабліва заблытана.

Недаацэнка барацьбы за правільны ўлік выявілася і ў тым факце, што прадстаўнікі некаторых арганізацый імкнуліся ўзваліць усю віну выключна на раёны і моўчкі абыходзілі дрэнную работу іх уласнага апарату.

***

Патрэбен неадкладны і карэнны пералом. Дырэктывы ЦК КП(б)Б аб наладжаньні выраснага правільнага ўліку загатовак павінны быць ажыцьцёўлены. Трэба даць руйнуючы адпор апартуністам, якія недаацэньваюць гэтай справы, уводзяць у зман партыйныя арганізацыі, ашукваюць грамадзкасьць.

Трэба прыцягваць да суровай адказнасьці тых, хто зрывае правільны ўлік загатовак.

С. Галкін.

Апартуністычнае праўленьне патурае спажывецкім настроям

СЛУЦАК. Райкалгассаюз ня ўжывае ніякіх мер для арганізацыйна-гаспадарчага ўмацаваньня калгасу «В. Беларусь». Зьдзельшчына ў калгасе існуе на паперы, нормы выпрацоўкі зацьверджаны надзвычай нізкія, расстаноўка сіл зусім дрэнная.

Адсутнасьць правільнай арганізацыі працы прывяла да зрыву выкананьня пляну асеньняй сяўбы. Замест вызначанага пляну ў 83 гэктары, праўленьне калгасу высунула свой «сустрачны» плян у 60 гэкт., а засеялі яшчэ менш—толькі 40 гэкт. Ня выкананы пляны зяблеўля.

Апартуністычная дзейнасьць праўленьня на гэтым не канчаецца. ПРЫ РАЗЬМЕРКАВАНЬНІ УРАДЖАЮ ПРАЎЛЕНЬНЕ, ПАТУРАЮЧЫ СПАЖЫВЕЦКІМ НАСТРОЯМ АДСТАЛАЙ ЧАСТКІ КАЛГАСЬНІКАЎ, ЗЬНІЗІЛА ВЫЗНАЧАНЫЯ ПЛЯНЫ ПА ЗАГАТОЎКАХ. Патрэбна здаць 105 цэнтн. збожжа, але на сёнешні дзень ня здана ніводнага пуда. Зусім не прыступілі да здачы 10.000 пудоў бульбы, вызначаных плянам.

ПЛЯН ЗАГАТОВАК ПРАЎЛЕНЬНЕ АБВЯСЬЦІЛА НЕРЭАЛЬНЫМ, І БУЛЬБЫ, НАПРЫКЛАД, ЯНО ДУМАЕ ЗДАВАЦЬ НЯ БОЛЬШ 1.000 ПУДОЎ.

Слуцкі райкалгассаюз павінен зьняць апартуністычнае кіраўніцтва калгасу. Разьмеркаваньнем даходаў па колькасьці і якасьці працы дабіцца ўкараненьня зьдзельшчыны, поўнага выкананьня пляну загатовак.

Л. ХАЎКІН.

Злачынная бязьдзейнасьць

Клічаўскі раён правальвае збожжазагатоўчую кампанію. З пяціднёўкі ў пяціднёўку загатоўкі збожжа ідуць ганебна нізкімі тэмпамі. За ўвесь час з пачатку кампаніі па раёне загатоўлена ўсяго **13,5 проц.** гадавога пляну.

Кулацтва і яго агентура, не сустракаючы рашучага адпору з боку раённых арганізацый і сельсаветаў, вядзе агітацыю сярод калгасьнікаў, беднякоў і сераднякоў супроць здачы збожжа дзяржаве.

Трэба моцна ўдарыць па бязьдзейнасьці раённых арганізацый. Трэба выганяць з радоў партыі апартуністаў, якія ўсіляюць дырэктывы партыі аб загатоўках праяўляюць злачынную бязьдзейнасьць па важнейшым вучастку клясавай барацьбы.

Не дапускаць перагібаў у крытыцы памылак навуковых работнікаў

На ранішнім пасяджэньні зьезду навуковых работнікаў 24 кастрычніка з прамовай выступіў праф. Рыўлін.

— Невыстарчальная ўвага паасобных дэлегатаў да дакладу наркамасьветы гаворыць аб тым, што гэтыя таварышы не зразумелі як сьлед важнасьці пастановы ЦК УсеКП(б) аб школе, не зразумелі таго, што гэтая пастанова ў вялікай меры адносіцца і да ВНУ.

Як абстаіць справа з клясьцю навучаньня ў вышэйшых навучальных установах?

У нас нярэдка роль прафэсара зводзяць да кансультанта, ён не адказвае за пасьпяховасьць кожнага студэнта. Такім чынам, як сярод студэнтаў, так і выкладчыкаў ВНУ панує ўраўнілаўка і абязьлічка.

На зьезьдзе нам трэба дасканала прапрацаваць пытаньне аб тым, як выкараніць гэтае зло.

Другое пытаньне — гаворыць тав. Рыўлін — гэта падрыхтоўка кадраў для кадраў.

Задача падрыхтоўкі ўласнай асьпірантуры — гэта адно з пытаньняў ажыцьцяўленьня ленінскай нацпалітыкі.

— Трэба асьпірантуру набіраць ня толькі непасрэдна з ВНУ. Яе неабходна набіраць і з работнікаў, якія маюць ужо практычны стаж. Гэта дасьць магчымасьць палепшыць склад асьпірантуры.

За час работы інстытуту асьпірантуры відавочна, што якасьць нашай асьпірантуры ў асноўным здавальняючая. Асьпіранты з посьпехам спраўляюцца з работай. Калі-б ня інстытут асьпірантуры мы мелі-б у гэтым годзе вялікі недахват выкладчыкаў для ВНУ.

ТАМУ ТРЭБА ВЕСЬЦІ РАШУЧУЮ БАРАЦЬБУ З КАКСЭРВАТЫЗМАМ І НЕДААЦЭНКАЙ ВАЖНАСЬЦІ СТВАРЭНЬНЯ СВАЁЙ АСЬПІРАНТУРЫ.

— Мы да гэтага часу, — гаворыць прамоўца, — не дабіліся патрэбнай палітычнай актыўнасьці нашых ВНУ. Рад ВНУ ПРАЙШЛІ МІМА ДЫСКУСІЙ аб дэборыншчыне, перавярэўшчыне і г. д. У падінстытуце, напрыклад, ня ведаюць аб дыскусіі, якая праводзілася партыяй у галіне педагогікі. Там ня ведаюць таксама, што Шульгін зьяўляецца носьбітам тэорыі «адміраньня школы» і г. д.

Хіба такое становішча можна далей цярпець?

Трэба, каб кіраўніцтвы партарганізацый ВНУ навучыліся весьці ідэалёгічную барацьбу так, каб на ёй выхоўваць масы студэнцтва.

У сувязі з гэтым тав. Рыўлін спыняецца на справе праф. ЗМАЧЫНСКАГА.

— У ліпені хэміка-тэхналёгічны інстытут нападзіў абгаварэньне апошніх прац прафэсара хэміі Змачынскага. Інстытут зусім правільна зрабіў, калі прыцягнуў да гэтай дыскусіі шырокія масы навуковых работнікаў.

Пасьля рэзкіх выступленьняў, якія абвінавачвалі Змачынскага ў радзе грубых мэтадалёгічных памылак, ён дэманстрацыйна пакінуў сход. Такія паводзіны бязумоўна маюць антыграмадзкі характар.

Аднак, замест таго, каб даць магчымасьць Змачынскаму ўсьвядоміць да канца свае памылкі, каб дапамагчы яму ўваладаць мэтадам дыялектычнага матэрыялізму, замест гэтага партыйныя і грамадзкія арганізацыі інстытуту дапусьцілі ПЭЎНЫ ПЕРАГІБ тым, што вынесьлі пастанову «хадайнічаць перад сэкцыяй навуковых работнікаў аб пазбаўленьні Змачынскага годнасьці прафэсара».

Бюро сэкцыі навуковых работнікаў правільна зрабіла, што адхіліла гэта хадайніцтва. Аднак, і бюро ў гэтай справе дапусьціла памылку. Бюро зафіксавала нязгоду з пазбаўленьнем прафэсарскай годнасьці, але ня вызначыла як сьлед сваіх адносін да ўсёй гэтай справы.

Бюро сэкцыі, з аднаго боку, не растлумачыла студэнтам сутнасьці справы, а з другога, — не націскала на самога Змачынскага. А між тым гэты націск зрабіць было неабходна. Аб гэтым сьведчыць сёнешняе выступленьне Змачынскага, у якім ЁН НЯСЬМЕЛА І ЗУСІМ НЕВЫСТАРЧАЛЬНА КРЫТЫКАВАЎ СВАЕ ПАМЫЛКІ.

Справа праф. Змачынскага вучыць таму, як ня трэба весьці ідэалёгічную барацьбу.

Бязумоўна, патрэбна і надалей праводзіць падобныя дыскусіі, патрэбна прыцягваць да гэтай справы найшырэйшыя масы навуковых арботнікаў, студэнцтва, рабочых з прадпрыемстваў, патрэбна глыбока прапрацоўвець пытаньне і па-бальшавіцку крытыкаваць памылкі. АДНАК, НЕЛЬГА ШКОДНА ДАПУСКАЦЬ ПЕРАГІБЫ.

Рашуча змагаючыся з імкненьнямі працягнуць чужыя пралетарыяту тэорыі мы абавязаны таварыскай крытыкай дапамагаць тым навуковым работнікам, якія яшчэ ня прышлі «да правільнага ўсьведамленьня марксыцка-ленінскага навуковага мэтаду».

«БЯЗЬЛІТАСНАЯ І РАШУЧАЯ КРЫТЫКА СКАЖЭНЬНЯЎ І АДХІЛЕНЬНЯЎ АД МАРКСЫЦКА-ЛЕНІНСКАЙ ТЭОРЫІ, ЯКАЯ ПАВІННА ПРАЦЯГВАЦЦА І БЫЦЬ УЗЬНЯТА НА БОЛЬШ ВЫСОКІ ТЭАРЫТЫЧНЫ ЎЗРОВЕНЬ, НІ Ў ЯКІМ ВЫПАДКУ НЕ ПАВІННА ПЕРАТВАРАЦЦА Ў АГУЛЬНАЕ ШАЛЬМАВАНЬНЕ, ДРОБЯЗНЫЯ ПРЫЧЭПКІ І БЕСПАДСТАЎНАЕ ПАЗБАЎЛЕНЬНЕ МАГЧЫМАСЬЦІ НАВУКОВА-ПЭДАГАГІЧНАЙ РАБОТЫ І ВЫПРАЎЛЕНЬНЯ СВАІХ ПАМЫЛАК».

Гэтае ўказаньне Цэнтральнага Камітэту КП(б)Б павінна быць ЦАЛКАМ ЗАХАВАНА ў далейшай ідэалёгічнай барацьбе, у крытыцы памылак паасобных навуковых работнікаў.

Ніжнягародзкі аўтагігант напярэдадні пуску

«Ніжнягародзкі аўтагігант будуе ўся савецкая краіна»—сказаў т. Арджанікідзэ, акрэсьліваючы значэньне гэтага заводу для нашага будаўніцтва. Ніжагародзкі аўтабуд будзе адным з буйнейшых аўтабудаўнічых заводаў у сьвеце. Пасьля пуску будаўніцтва першай чаргі ён будзе выпускаць 60.000 аўтамабіляў, а пры поўным пуску—140.000 машын у год. Пуск будаўніцтва першай чаргі адбудзецца 1-га лістапада г. г. Зараз на аўтабудзе ўжо скончаны амаль усе асноўныя будаўнічыя работы. Скончена пабудова ліцейнага цэху, буйнейшага ў СССР. Гэта па сутнасьці цэлы завод, які будзе ўладаць 450 агрэгатамі. З гэтых агрэгатаў многія ўжываюцца ў СССР першы раз. У ліцейным цэху пачат мантаж навейшага імпартнага абсталяваньня. Савецкія мантажнікі, пад кіраўніцтвам савецкіх інжынэраў, пасьляхова аўладаюць перадавой замежнай тэхнікай. Ударнікі далі абавязацельства пусьціць завод ва што-б там ні стала да 14-й гадавіны Кастрычніка.

На здымках: зьверху — рабочы пасёлак, зьнізу выгляд Ніжагародзкага аўтазаводу.

ПАСТАНОВА

ЦК КП б)Б аб мерапрыемствах па ўзмацненьні барацьбы гарадзкіх і раённых газэт за выкананьне плянаў загатовак

1. Згадзіцца з прапановаю культпропу ЦК КП(б)Б аб часовым пераводзе на месячны тэрмін Мазырскай, Рэчыцкай, Полацкай, Лепельскай і Вушацкай раённых газэт на штодзенны выхад (2 разы у пяціднёўку на 4 старонках і два разы ў пяціднёўку на 2 старонках), а таксама аб выданьні на працягу месяца Тураўскай, Чавускай, Жыткавіцкай, Бягомльскай, Чэрвеньскай, Плешчаніцкай і Лельчыцкай раённымі газэтамі штодзённых аперацыйных бюлетэняў аб ходзе выкананьня ўсіх відаў загатовак (бюлетэнь выдаваць разьмерам у палову, або ¼ частку сучаснага разьмеру газэт).

а) Абавязаць камітэт па справах друку пад пэрсанальную адказнасьць т.т. Горыша і Александровіча, і Белдзяржснаб пад пэрсанальную адказнасьць т. Каца ў 24 гадзіны забясьпечыць вышэйпералічаныя газэты выстарчальнай колькасьцю паперы за кошт рашучага зьмяншэньня задаваленьня іншых заявак.

б) Абавязаць рэдакцыю газэты «Зьвязда» (пад пэрсанальную адказнасьць тав. Мітліна) вылучыць для месячнай работы ў Мазырскай, Лепельскай раённых газэтах двух работнікаў, рэдакцыю газэты «Савецкая Беларусь» (пад пэрсанальную адказнасьць т. Адамсона) двух работнікаў для Тураўскай і Чавускай раённых газэт, рэдакцыю газэты «Рабочий» (пад пэрсанальную адказнасьць т. Красінай) аднаго работніка для Лельчыцкай раённай газэты, рэдакцыю газэты «Акцябр» (пад пэрсанальную адказнасьць т. Дупца) аднаго работніка для Бягомльскай раённай газэты, рэдакцыю газэты «Калгаснік Беларусі» (пад пэрсанальную адказнасьць т. Міхайлава) — аднаго работніка для Чэрвеньскай раённай газэты, рэдакцыю газэты «Рабселькор» (пад пэрсанальную адказнасьць тав. Чарлякова) — аднаго работніка для Плешчаніцкай раённай газэты, рэдакцыю газэты «Чырвоная Зьмена» (пад пэрсанальную адказнасьць т. Анісава) — аднаго работніка для Вушацкай газэты і рэдакцыю газэты «Палеская праўда» (пад пэрсанальную адказнасьць т. Давыдовіча) — аднаго работніка для Жыткавіцкай раённай газэты.

Вылучэньне гэтых работнікаў (абавязкова з найбольш кваліфікаваных і партыйна-вытрыманых) правесьці ў адведзёны тэрмін. Прозьвішча вылучаных таварышоў у адналецны тэрмін паведаміць культпропу ЦК КП(б)Б.

2. Абавязаць сэктар друку культпропу ЦК КП(б)Б забясьпечыць першачарговае вымяшчэньне на старонках цэнтральных газэт аглядаў раённых газэт у справе выкананьня плянаў загатовак і барацьбы за гаспадарчае замацаваньне калгасаў.

3. На бліжэйшым пасяджэньні сакратарыяту ЦК КП(б)Б заслухаць даклады рэдакцый дзьвюх раённых газэт аб удасканаленьні гэтых газэт у барацьбе

Да пачатку новага парадку крэдытаваньня засталося 5 дзён

Зламаць пасыўнасьць гаспадарчых арганізацый

„ЦК і СНК папярэджваюць, што новы парадак крэдытаваньня будзе праведзен безагаворачна з 1 лістапада. Гаспадарчыя органы, якія не падрыхтуюцца да новага парадку крэдытаваньня, ня змогуць атрымаць крэдытаў у банку. І адказнасьць за затрудненьні, у якія будуць пастаўлены прадпрыемствы з-за нераспарадчасьці і непадрыхтаванасьці гаспадарчых органаў, ляжа на кіраўнікоў апошніх".

(З пастановы ЦК УсеКП(б) і СНК СССР)

Ніводнае аб'яднаньне ня рыхтуецца па-баявому да новага парадку крэдытаваньня

Парткалектывы, ячэйкі, прафарганізацыі павінны неадкладна мабілізаваць усю рабочую грамадзкасьць, увесь рахунковы і фінансавы апарат на выкананьне дырэктыў ЦК УсеКП(б) і СНК СССР

Матар'ял аб падрыхтоўцы гаспадарчых органаў да новага парадку крэдытаваньня сабраны брыгадамі Дзяржбанку ў складзе т. ЛІХТЭРМАНА (рабочы заводу «Бальшавік»—ашчуміашчальнік загадчыка крэдытна-плянавым сэктарам) і работнікаў банку таварышоў ПАЎЛАВА, ТРУХАНА, ЦІМАНКОВА, ФРАДКІНА і інш.

ЛІКВІДАВАЦЬ ПРАРЫЎ

Абсьледаваньнем прадпрыемстваў ВСНГ, мясцовай прамысловасьці і Наркамснабу, якія зьяўляюцца аб'ектамі крэдытаваньня Менскім аддзяленьнем Дзяржбанку, выяўлен далёка нярадасны малюнак у справе падрыхтоўкі да правядзеньня мерапрыемстваў па ўзмацненьні гаспадарчага разрахунку на аснове закону ад 23 ліпеня.

Для іностраўцаў возьмем некалькі з 30-ці абсьледаваных у гэты дзень (24 кастрычніка) прадпрыемстваў.

Завод ІМЯ БАРАШЫЛАВА ня мае яшчэ ўласных зваротных сродкаў. МЭТАЛЯАБ'ЯДНАНЬНЕ правяло алімпійскі спакой у гэтым пытаньні. Рэалізацыя прадукцыі не забясьпечана дагаворамі. Натрыклад, дагавор са «Стройметэкспортам» на пастаўку грэйсартовак. Паводле дагавору завод павінен здаць у месяц грэйсартовак на 68.000 руб., а паводле вытворчай праграмы завод павінен выробіць гэтых машын на 180.000 руб. у месяц. Кулы завод павінен падзець рэшту прадукцыі—невядома. З «Всехимтрестом» заключан дагавор на пастаўку цэнтрафуг: паводле дагавору завод павінен здаць прадукцыі на 21.000 руб., а праграма заводу складае 140.000 руб. Нагул, ДАГАВОРОМ НА ЗАВОДЗЕ ІМЯ БАРАШЫЛАВА НЕ АДДАЕЦЦА НАЛЕЖНАЯ УВАГА. Гэтым фактычна ў корані падрываецца гаспадарчы разрахунак, хоць у справе пераводу цэхаў і пераходу брыгад на гаспадарчы разрахунак там ёсьць некаторыя дасягненьні. Праўда, кантролю рублём у цэхах яшчэ не праводзіцца з усёй жорсткасьцю. Аналягічны малюнак на заводзе «КАМУНАР».

Возьмем завод іншага аб'яднаньня—ХЛЕБАЗАВОД. Праўда, былі гутаркі з Белпрамхлебам аб выпучэньні для заводу зваротных сродкаў, але дэлей гутарак справа не пайшла. Завод перайшоў ад МЦРК у аб'яднаньне Белпрамхлеба яшчэ ў ліпені, а пытаньне аб пакрыцьці запазычанасьці па капітальным будаўніцтве ў памерах каля 400-500 тысяч рублёў застаецца адкрытым—нікім і з якіх сум яна будзе пакрыта—НЕВЯДОМА. Баланс ёсьць толькі на 1 верасьня. Дагаворы ёсьць толькі на ліпень, больш позьніх дагаворў няма. Другое прадпрыемства Наркамснабу — завод «БЕЛАРУСЬ» — таксама зваротнымі сродкамі не надзелена, балянсу на 1 кастрычніка няма.

Фабрыкі **«УСХОД» І ЛЯМЦАВАЯ** таксама ня маюць яшчэ ўласных зваротных сродкаў, ня гледзячы на тое, што ЯНЫ ДАЛІ ІНСПЭКЦЫІ МЯСЦОВАЙ ПРАМЫСЛОВАСЬЦІ ПАТРЭБНЫЯ МАТАР'ЯЛЫ ДЛЯ ВЫЗНАЧЭНЬНЯ СУМ ЗВАРОТНЫХ СРОДКАЎ.

Справаздачнасьць па гэтых прадпрыемствах у самым дрэнным становішчы, а гаспадарчага разрахунку без справаздачнасьці, зразумела, не наладзіш. Справаздачны баланс ёсьць толькі НА 1 ЛІПЕНЯ.

Такім чынам можна падвесьці вынік: БОЛЬШАСЬЦЬ ПРАДПРЫЕМСТВАЎ ЗВАРОТНЫМІ СРОДКАМІ НЕ ЗАБЯСЬПЕЧАНЫ, ДЫРЭКТЫЎНЫЯ БАЛЯНСЫ НА IV КВАРТАЛ ДЛЯ КОЖНАГА ПРАДПРЫЕМСТВА АБ'ЯДНАНЬНІ НЕ ЗАЦЬВЕРДЗІЛІ, ЛІМІТАЎ НА СЭЗОННЫЯ НАКАПЛЕНЬНІ АБ'ЯДНАНЬНІ ДЛЯ ПРАДПРЫЕМСТВАЎ НЕ ЎСТАНАВІЛІ, СПРАВАЗДАЧНЫХ БАЛЯНСАЎ НА 1 КАСТРЫЧНІКА НЯМА. Апарат прадпрыемстваў і самі дырэктары з новымі фармамі крэдытаваньня амаль незнаёмы (за выключэньнем бухгальтараў).

Нізавыя партыйныя і прафсаюзныя арганізацыі нічога яшчэ не зрабілі для таго, каб растлумачыць рабочай масе сутнасьць новых форм крэдытаваньня. Чым гэта пагражае?

Гэта пагражае закрыцьцём крэдытаў для многіх прадпрыемстваў, бо аддзяленьне Дзяржбанку з усёй жорсткасьцю з 1 ліпеня будзе праводзіць крэдытаваньне паводле закону ад 23 ліпеня, г. зн. будзе давець пазычкі, кіруючыся сапраўдным забясьпячэньнем гэтых пазычак. Ня маючы сродкаў на сваім рахунку, прадпрыемствы могуць аказацца ў цяжкім становішчы. Уся адказнасьць (аб гэтым ясна гаворыць пастанова ЦК УсеКП(б) і СНК) ляжа на КІРАЎНІКОЎ ПРАДПРЫЕМСТВАЎ І АБ'ЯДНАНЬНЯЎ.

Што трэба зрабіць? Аб'яднаньні ВСНГ, Наркамснабу, а таксама інспэкцыя мясцовай прамысловасьці павінны НА ПРАЦЯГУ 2-3 ДЗЁН зацьвердзіць дырэктыўныя балянсы сваіх прадпрыемстваў на IV квартал, устанавіць ім ліміты на сэзонныя накапленьні і надзяліць іх уласнымі зваротнымі сродкамі. Прадпрыемствы для атрыманьня банкаўскіх крэдытаў павінны на пазьней БЛІЖЭЙШЫХ ДВУХ ДЗЁН падаць у банк прамфінплян, справаздачныя балянсы, дагаворы на рэалізацыю прадукцыі і ў паасобных выпадках на забясьпячэньне (там, дзе ў дагаворы прадугледжан разьлік па акрэдытыве або па асобным рахунку), а таксама прадставіць весткі для ўстанаўленьня сум у дагаворе.

Партыйныя і прафсаюзныя арганізацыі прадпрыемстваў павінны мабілізаваць рабочую масу на ліквідацыю гэтага прарыву. Трэба спадзявацца, што агульнымі сіламі гэта задача будзе выканана.

КЕЙЛІН.

Падрыхтоўка—у габінэтным парадку

Швэйкае аб'яднаньне

Падрыхтоўка да пераходу на новыя формы крэдытных узаемаадносін з банкам праходзіць на Белшвэйаб'яднаньні ў габінэтным парадку. Грамадзкасьць стаіць у баку. Ніякай растлумачальнай работы на прадпрыемствах не праведзена.

Фабрыкі Швэйаб'яднаньня яшчэ не атрымалі нагат арыентовачных лічбаў зваротных сродкаў. На саміх фабрыках пытаньне аб зваротных сродках яшчэ не стаяла. Справаздачнасьць па некаторых прадпрыемствах значна адстае. Натрыклад, адстае на магілеўскай швэйнай фабрыцы імя Валадарскага, якая мае даволі моцны бухгальтарскі апарат. Аднак, работнікі гэтага моцнага апарату працуюць у сябе акуратна ад 9 раніцы да 4 гадзін дня, а ў вячэрні час лічаць больш мэтазгодным падзарабіць у іншых установах, чым клапаніцца аб сваячасовым складаньні балянсу на сваёй фабрыцы.

Да пачатку новага парадку крэдытаваньня засталося 5 дзён. Белшвэйаб'яднаньне і швэйныя фабрыкі павінны зрабіць з гэтага адпаведныя высновы.

Ёсьць баланс... на 1 студзеня!

Белторфааб'яднаньне

Зваротныя сродкі, вызначаныя рэспубліканскімі органамі, да гэтага часу не разьмеркаваны. Брыгаду супакоілі, што гэта справа будзе зроблена 28 кастрычніка. Аднак, ніякай падрыхтоўчай работы не праведзена.

Грамадзкасьць стаіць ад гэтай справы ў баку. Старшыня мясцкому тав. Курсін наогул ня ведае аб тым, што аб'яднаньню вызначаны зваротныя сродкі і што апарат павінен гэтыя сродкі разьмеркаваць паміж прадпрыемствамі.

Справаздачнасьць у Белторфаб'яднаньні пастаўлена дрэнна. Баланс ёсьць толькі на 1 студзеня 1931 году. Баланс на 1 красавіка зьведзен, але ніхто работнікі аб'яднаньня лічаць яго нядобраякасным. На 1 ліпеня няма балянсаў ад 9 больш буйных заводаў. Аб'яднаньне пасылае на заводы сваіх інструктароў, выдаткоўвае шмат грошай, але справаздачнасьць ня рухаецца з месца.

Праграма па адабычы торфу выканана на 54 проц. Дагаварамі са спажыўцамі прадугледжана вывазка торфу сільмі і сродкамі торфзаводаў. Зараз вывазка ўскладзена на пакупцоў, у дагаворах са спажыўцамі адпаведныя зьмены ў сувязі з гэтым ня ўнесены, такім чынам, хто будзе адказваць за сваячасовую вывазку торфу — ніхто ня ведае.

Недахопы ў рабоце Белторфаб'яднаньня работнікі тлумачаць «аб'ектыўнымі» прычынамі—разьездамі па заводах (?) і інш.

Такая работа ставіць пад пагрозу сваячасовае забясьпячэньне торфазаводаў зваротнымі і крэдытнымі сродкамі ў самы адказны пэрыяд—пэрыяд падрыхтоўкі балот да сэзону 1932 году.

Заселі толькі ў апошнія дні

Белмэталяаб'яднаньне

Зваротныя сродкі паміж прадпрыемствамі Белмэталяаб'яднаньня да сёньняшняга дня яшчэ не разьмеркаваны. За гэту працу работнікі апарату заселі толькі ў апошнія дні. Але ніхто не падумаў аб тым, каб запрасіць для ўдзелу ў гэтай рабоце работнікаў прадпрыемстваў.

Баланс ёсьць толькі на 1 жніўня ў той час, як ён павінен быць за верасень месяц. Што зроблена аб'яднаньнем для таго, каб сваячасова атрымаць заводзкія балянсы? Белмэталяаб'яднаньне абмежавалася толькі інструктажам сваіх прадпрыемстваў і ўвядзеньнем прэміяльна-зьдзельнай аплаты рахункавым работнікам. Па думцы адміністрацыі новая сыстэма аплаты дасьць станоўчыя вынікі. Але нават пры новай сыстэме аплаты ёсьць пагроза спазьненьня гэтай работы. Белмэталяаб'яднаньню трэба было, па прыкладзе іншых устаноў (Лесбел, Дзярбанк), арганізаваць падрыхтоўчыя курсы рахунковых работнікаў.

Разьмеркаваньне зваротных сродкаў Белмэталяаб'яднаньне абяцала прадставіць у банк толькі 28 кастрычніка. Абяцаньне павінна быць выканана.

Грошы ёсьць, падрыхтоўкі няма

Шчотачная фабрыка імя Крупскай

Фабрыка атрымала паведамленьне аб'яднаньня аб вызначэньні зваротных сродкаў у суме 430.000 рублёў. Аднак, никай падрыхтоўчай работы да пераходу на новыя формы узаемачасоін з банкам фабрыка не правяла. Баланс ёсьць толькі на 1 верасьня. Баланс на 1 кастрычніка чакаецца 27 кастрычніка.

Спакойна... чакаюць

Гута „Пралетары"

Гута спакойна чакае паведамленьня аб зваротных сродках ад аб'яднаньня. Рахунковы апарат, апрача галоўнага бухгальтара, не знаёмы з законам аб узмацненьні гаспадарчага разрахунку. Толькі ў апошнія дні апарат мабілізаваны на ліквідацыю прарываў у бухгальтэрыі. Баланс на 1 кастрычніка абяцаюць скласьці не пазьней 26 кастрычніка.

Пры існаваньні пляну рэалізацыі прадукцыі на 270.000 руб., дагаворы са спажыўцамі заключаны ўсяго на 249.000 руб.

Грамадзкасьць у падрыхтоўцы да новага парадку крэдытаваньня ўдзелу ня прымае.

Хто дасьць грошы Аптэкакіраўніцтву?

Белаптэкакіраўніцтва

Прадстаўнік Аптэкакіраўніцтва заявіў брыгадзе Дзяржбанку, што ён ня ведае, хто іх павінен надзяліць уласнымі зваротнымі сродкамі. Яны чакаюць нейкіх указаньняў Дзяржбанку наконт гэтага (?). Гэта—адзіная ўстанова, у якой брыгады Дзяржбанку спаткалі такія агідна-нядбайныя адносіны да ўласнага лёсу.

„Чырвоная Бярэзіна" затрымлівае баланс

Запалкавае аб'яднаньне

адно з нямногіх аб'яднаньняў, якое разьмеркавала паміж фабрыкамі атрыманыя ад ВСНГБ зваротныя сродкі. Але... гэта разьмеркаваньне застаецца ў сьценах габінэту дырэктара аб'яднаньня. Чаму яны ня спусьцілі вызначаных зваротных сродкаў прадпрыемствам? Прадстаўнік аб'яднаньня тлумачыць гэта тым, што ВСНГ быццам не дазваляе спусьціць прадпрыемствам гэтыя сродкі і, пакуль не дазволіць, яны спушчаны ня будуць...

Між іншым, зваротныя сродкі былі разьмеркаваны без удзелу прадстаўнікоў фабрык. Чарговы баланс ёсьць на 1 жніўня. Прычынай несвачасовага складаньня балянсу на 1 кастрычніка зьяўляецца затрыманьне балянсу з боку фабрыкі «Чырвоная Бярэзіна».

Ніякіх указаньняў прадпрыемствам аб новым парадку крэдытаваньня з 1 лістапада запалкавае аб'яднаньне не дало. Толькі пасьля візыту брыгады Дзяржбанку аб'яднаньне абяцала пачаць структураваць свае фабрыкі.

Тав. Драбкін не сьпяшаецца

Шкловаб'яднаньне

Зваротныя сродкі, атрыманыя Шкловаб'яднаньнем паводле першага варыянту, зацьверджанага ўрадавай камісіяй ВСНГ, былі паміж заводамі разьмеркаваны. Але пасьля разгляду гэтага пытаньня ў цэнтральных органах СССР быў складзен другі варыянт. Ня гледзячы на кароткі час, які застаўся да 1 лістапада зваротныя сродкі паводле другога варыянту паміж прадпрыемствамі яшчэ не разьмеркаваны. Паводле заявы галоўбуха тав. Драбкіна работа гэта будзе окончана не пазьней 28 кастрычніка, г. зн. пазьней мінімум на тры дні. Між іншым, і тут разьмеркаваньне зваротных сродкаў робіцца бяз удзелу прадстаўнікоў заводу.

Складаньне чарговага балянсу за верасень запляваецца па віне заводаў «Ільіч» і «Ноўка». Аб'яднаньне не падумала нават аб тым, каб інструктаваць прадпрыемствы аб новых формах узаемаадносін з банкам. Толькі пасьля наведваньня брыгады Дзяржбанку яны абяцалі закупіць патрэбныя бланкі і разаслаць інструкцыі аб парадку пераходу на новыя формы работы.

Са спазьненьнем на 15 дзён

Аб'яднаньне будматар'ялаў

Зваротныя сродкі аб'яднаньне перадало заводам поўнасьцю і сваячасова. За гэта трэба хваліць. Але вось з балянсам справа стаіць дрэнна. Чарговы баланс ёсьць толькі на 1 ліпеня. На 1 кастрычніка будзе не раней 15 лістапада. Гэта значыць, што на 15 дзён і нават больш аб'яднаньне будматар'ялаў парве свае ўзаемаадносіны з банкам.

Такое становішча атрымалася таму, што аб'яднаньне не палічыла патрэбным інструктаваць свае заводы аб значэньні новых форм крэдытаваньня з 1 лістапада. Знайшліся, зразумела, «аб'ектыўныя» прычыны: адсутнасьць кіраўніка, аднаўпак галоўбуха і г. д. Нават сам апарат аб'яднаньня з новымі мерапрыемствамі па ўзмацненьні гаспадарчага разрахунку знаёмы толькі па дакладах банку на нарадах гаспадарнікаў.

Агульнае ўражаньне ад падрыхтоўкі аб'яднаньня да 1 лістапада—вельмі сумнае.

Аб'яднаньню трэба вучыцца ад заводу

Белскураб'яднаньне

Спроба брыгады Дзяржбанку абсьледаваць Белскураб'яднаньне спатакала вельмі няпрыветлівы прыём з боку кіраўніка аб'яднаньня тав. Эпштэйна, які катэгарычна адмовіўся займацца гэтым пытаньнем. «Калі хочаце—прыходзьце на нараду, якую я склікаю ў 7 гадзін вечара».

Усё-ж брыгада выявіла, што Белскураб'яднаньне справай надзяленьня прадпрыемстваў зваротнымі сродкамі амаль што не займалася. Папярэдняя работа зроблена выключна ў габінэтным парадку і прадпрыемствам невядома. Аб'яднаньне не паклапацілася нават паведаміць сваім фабрыкам і заводам тыя кантрольныя лічбы зваротных сродкаў, якія яно ім вызначае. Грамадзкасьць аб'яднаньня стаіць у баку ад гэтай справы. Новы закон аб крэдытаваньні не даведзен да рабочых мас.

„Бальшавік" амаль падрыхтаван

Гарбарня „Бальшавік"

Ад свайго аб'яднаньня гарбарня зваротных сродкаў не атрымала. Аднак, не чакаючы пакуль разварушыцца апарат Белскураб'яднаньня, работнікі заводу самі правялі папярэднюю работу па выяўленьні патрэбнасьці заводу ў зваротных сродках. Але са справаздачнасьцю справа стаіць ня зусім добра. Баланс ёсьць на 1 верасьня, а на 1 кастрычніка яны мяркуюць скласьці 26-27 кастрычніка (са спазьненьнем на 6 дзён).

Рахунак адгружаных тавараў—не ў ажуры, трэба ня менш 2-3 дзён, каб яго падагнаць. Работнікі апарату абяцалі гэта зрабіць сваячасова. Дагаворы на рэалізацыю афармлены.

Такім чынам, завод «Бальшавік» зможа ўжо з 1 лістапада атрымаць з банку вызначаныя яму грошы.

Кадры—сацыялістычнаму будаўніцтву

Павышэньне пэрсанальнай адказнасьці выкладчыкаў і студэнтаў—

ВАЖНЕЙШАЕ ЗЬВЯНО БАРАЦЬБЫ ЗА ЯКАСЬЦЬ РАБОТЫ ВНУ

Узьняць якасьць

Як для сярэдняй і пачатковай школы, так і для ВНУ палепшэньне ЯКАСЬЦІ зараз зьяўляецца ЦЭНТРАЛЬНАЙ ЗАДАЧАЙ.

Бясспрэчна, што адна з прычын параўнальна нізкай якасьці выпускнікоў ВНУ закладзена ў нездавальняючай рабоце сярэдняга зьвяна. Але было-б няправільным толькі ў гэтым бачыць прычыны. У самой рабоце ВНУ у налічэньні цэлы рад буйнейшых недахопаў, якія прыводзяць да нізкай якасьці навучаньня.

Па-першае, аб'ектыўна і ўрэгулёўна. Яны выяўляюцца ў тым, што паасобныя выкладчыкі сваю ролю зьвялі выключна да кансультанта і ня хочуць ад кажнаго за пасьпяховасьць кожнага студэнта ў паасобку. Яны выяўляюцца і ў тым, што пераход з курсу на курс робіцца абязьлічана, агулам, бяз уліку пасьпяховасьці кожнага студэнта.

У практыцы работы ў наяўнасьці цэлы рад ускажэньняў брыгаднага прынцыпу заняткаў. Брыгады нярэдка камплектуюцца з раўненьнем на слабейшых і зводзяць сваю работу да голосных чытак. З-за адсутнасьці індывідуальнай адказнасьці, той, хто любіць падгуляць, мае магчымасьць схавацца за плячыма добраасумленных і мацнейшых студэнтаў сваёй брыгады.

Другая прычына, якая мае пэўны ўплыў на якасьць—гэта неўдасканаленасьць ва многіх выпадках профіля спэцыяліста.

У некаторых новаарганізаваных ВНУ справа даходзіла да таго, што профіль спэцыяліста і навучальныя праграмы мяняліся па 10 раз на працягу аднаго навучальнага году.

ДРЭННА ТАКСАМА ПАСТАЎЛЕНА ПРАКТЫКА СТУДЭНТАЎ. Да гэтага часу ня зжыты факты наплявацельскіх адносін гаспадарнікаў да практыкантаў. Студэнты ўсё яшчэ выкарыстоўваюцца на чорных работах цэлага раду фабрык і заводаў. А між тым, ДРЭННАЯ ПРАКТЫКА—ГЭТА ПРОСТЫ ЎДАР ПА ЯКАСЬЦІ.

Зжыцьцё ўсіх гэтых недахопаў і асабліва ліквідацыя абязьлічкі ў выкладаньні, павышэньне адказнасьці як студэнтаў, так і выкладчыкаў павінны быць пастаўлены, як БАЯВАЯ ЗАДАЧА ПАРТЫЙНЫХ І ГРАМАДЗКІХ АРГАНІЗАЦЫЙ ВНУ. Патрэбна, каб выкладчык НЯ быў простым кансультантам, а ЦАЛКАМ адказваў за пасьпяховасьць кожнага студэнта ў ПААСОБКУ.

Пара таксама, каб органы Нарасьветы перайшлі ад разважаньняў да канкрэтных спраў па палепшэньні мэтадычнага кіраўніцтва ВНУ. У прыватнасьці неабходна хутчэй правесьці перагляд і карэнную перапрацоўку праграм на аснове марксызму-ленінізму.

Разам з тым неабходна дабіцца БОЛЬШАЙ АДКАЗНАСЬЦІ ў кіраўніцтве работай ВНУ з боку тых гаспадарчых арганізацый, пад ведамам якіх яны знаходзяцца. Трэба, каб гэтыя ўстановы ШТОДЗЁННА клапаціліся аб станоўішчы вучобы, аб забясьпячэньні памяшканьнямі, аб матар'яльным становішчы студэнтаў і г. д. Час выкараніць такія факты, аб якіх паведамляе ў сёньнішнім нумары «Зьвязды» брыгада студэнтаў дарожнага тэхнікуму.

Галоўдартранс, НКЗ, Лесбел і іншыя гаспадарчыя установы павінны СЫСТЭМАТЫЧНА І ДЗЕЙСНА кіраваць падначаленымі ім ВНУ.

Ліквідаваць разьбежку

Торфараспрацоўкі БССР маюць вялікую патрэбу ў кадрах інжынэраў — эксплёататараў і мэханікаў.

Асінторф мае толькі аднаго інжынэра-эксплёататара, а большасьць торфараспрацовак іх ня мае зусім.

Эксплёатацыйнае аддзяленьне торфінстытуту на другім курсе ня мае ніводнага студэнта, у той час, як другі курс хэміка - тэхналёгічнага аддзяленьня, якое рыхтуе інжынэраў па каксаваньні і газафікацыі торфу, мае 53 чалавекі, а ўсё аддзяленьне—71 чалавек.

Газафікатары зараз менш патрэбны краіне, чым эксплёататары торфу. Атрымалася такім чынам разьбежка паміж патрэбнасьцю і колькасьцю кадраў, якія рыхтуюцца на вядучых спэцыяльнасьцях.

Неабходна безадкладна папоўніць другі курс эксплёатацыйнага аддзяленьня з другога курсу хэміка - тэхналёгічнага, што зрабіць магчыма, бо на першым курсе пройдзены толькі агульна - адукацыйныя дысцыпліны. Калі гэта ня будзе зроблена зараз, студэнты страцяць па году вучобы.

Другі факт — на абсталяваньне лябараторыі хэміка - тэхналёгічнага аддзяленьня затрачана 50 проц. бюджэту інстытуту.

У гэтым годзе першы курс хэмтэхаддзяленьня не набіраўся, што парушае прынцып бесьперапынных выпускаў і сродкі, затрачаныя на лябараторыі ня будуць з поўным эфэктам выкарыстаны. У гэты-ж час лябараторыі вядучых спэцыяльнасьцяй — эксплёатацыйнага і мэханічнага аддзяленьняў як сьлед не абсталяваны.

ВСНГ павінен устанавіць цьвёрдыя суадносіны, выходзячы з патрэб на падрыхтоўку кадраў асобных спэцыяльнасьцяй па торфе.

А. КРЫВАНОСАЎ.

Галавацяпы з Галоўдартрансу ня турбуюцца...

Пасьля арганізацыі Менскага палітэхнікуму ў архітэктурны, дарожны, гідратэхнічны і вячэрні рабочы тэхнікумы, будынак палітэхнікуму ня мог зьмясьціць усіх студэнтаў новых самастойных тэхнікумаў.

Апрача гэтага, паводле загаду ВСНГ, трэці паверх заняў тарфяны інстытут. Такім чынам дарожны тэхнікум апынуўся на вуліцы.

Ня гледзячы на сыгналы «Зьвязды», сэктар кадраў ВСНГ і загадчык сэктару кадраў Галоўдартрансу Хвасьцюк ня ўжылі ніякіх мер да вырашэньня гэтага пытаньня. Больш таго, ведаючы становішча тэхнікуму, Хвасьцюк загадаў дырэктару распачаць заняткі не пазьней 15-га кастрычніка.

Студэнты зьехаліся сваячасова, аднак ні інтэрнату, ні памяшканьня для заняткаў няма.

Загадам дырэктара тэхнікуму Аходіна новы набор быў выкінуты і адпраўлен зноў да хаты.

Брыгада студэнтаў дарожнага тэхнікуму зварачалася да старшыні ўрадавай камісіі тав. Каранеўскага, апошні адпраўляе ў СНК, СНК у іншыя установы і г. д.

Гэтым пытаньнем цікавіўся і гарком КП(б)В, аднак вынікаў ня відаць.

Дзякуючы такому становішчу шмат студэнтаў пакінулі тэхнікум, значная частка імкнецца перавесьціся ў іншыя навучальныя установы, або зусім кінуць вучобу.

Пракуратуры неабходна ў бліжэйшыя дні заняцца гэтай справай і прыцягнуць да адказнасьці галавацяпаў, зрыўшчыкаў падрыхтоўкі кадраў, якія думаюць што раз тэхнікум дарожны, дык ён і зьмяшчацца можа на вуліцы.

Брыгада студэнтаў:
АКУНЕЎ, ХАРЫТАНОВІЧ, ФАРБМАН, АГЕЕЎ, БАРАВІК, ЭСТЭРКІН.

Па важнейшых дысцыплінах зрываецца навучальны плян

У бабруйскім лесатэхнічным тэхнікуме, з прычыны няўдалага падбору выкладчыкаў, быў сарваны акадэмічны плян першага навучальнага году.

З-за нізкай якасьці выкладаньня лясной гаспадаркі студэнты не атрымалі патрэбных ведаў па гэтай дысцыпліне. Выкладчык хэміі па хваробе працуе ніў больш 100 лекцый, якія ня былі заменены другімі выкладчыкамі, у выніку праграма недавыкапана на 30%. Выкладчык тэхналёгіі працуе ніў больш як на 50% і г. д.

Пачатак другога навучальнага году паказвае, што спэцыяльна-тэхнічныя дысцыпліны зрываюцца яшчэ ў большай меры, як у мінулым годзе.

Вось некалькі лічбаў за першыя дзьве дэкады: па машынаназнаўстве замест 32 вучэбных гадзін было дана 18 гадзін; па электратэхніцы замест 24 гадзін—8; а па сталярнай справе замест 17 гадзін—ніводнай і г. д. Агулам па спэцыяльных і інш. дысцыплінах за першыя дзьве дэкады працуючана 50 гадзін.

Як відаць, зрываюцца выключна спэцыяльна-тэхнічныя дысцыпліны, выкладчыкамі якіх зьяўляюцца інжынэра-тэхнічныя працаўнікі бабруйскага камбінату. Адміністрацыя, партком і заўком камбінату нічога не зрабілі для наладжаньня работы інжынэрна-тэхнічнага пэрсаналу так, каб гэта не адбівалася на заняткох у тэхнікуме.

Дырэкцыя і навучальная частка тэхнікуму, ня гледзячы на сыгналы раённай газэты «Камуніст», праяўляюць поўную бязьдзейнасьць. Расклады лекцый часта мяняюцца. Выкладчыкі ня ўцягнуты ў грамадзкую працу і нават не наведваюць вытворчых нарад і сходаў тэхнікуму.

Неналаджанасьць грамадзкага харчаваньня таксама дрэнна адбіваецца на рабоце тэхнікуму. Студэнты харчуюцца ў агульна-гарадзкой сталоўцы і із-за чаргі несвачасова зьяўляюцца на лекцыі. Студэнцкай сталоўкі гарсавет і праўленьне БЦРК па невядомых прычынах не адкрываюць.

Кіраўніцтва тэхнікуму ігнаруе дырэктывы партыі і ўлады аб беларусізацыі. Амаль уся работа, пачынаючы ад выкладаньня і канчаючы сходамі, праводзіцца на расійскай мове.

Навучальны плян да кожнай брыгады і студэнтаў не даведзен. Цыклявыя камісіі не працуюць.

Няма ніякай увагі да працы тэхнікуму з боку Беллесправу і Галоўлесправу. РСІ патрэбна прыцягнуць да адказнасьці тых, хто зрывае выкананьне задач падрыхтоўкі кадраў.

РК КП(б)Б і РайІНА павінны ўзмацніць кіраўніцтва работай тэхнікуму.

Вінік П. А., Кацнэльсон М., Палей Ш.

Катэдры інстытуту адарваны да вытворчасьці

Падрыхтоўка кадраў лясной гаспадаркі і прамысловасьці мае для БССР выключна важнае значэньне. Аднак, адзіны ў БССР лесатэхнічны інстытут, які знаходзіцца ў Гомелі, ня выходзіць з паласы прарываў па важнейшых галінах сваёй работы.

Інстытут знаходзіцца ў непрыстасаваным пад навучальную ўстанову памяшканьні. Катэдры, якія пераведзены з лесфаку горацкай акадэміі, прымушаны разьмяшчаць свой матар'ял па цёмных калідорах.

Пастанова першага зьезду саюзу лесарубаў аб будаўніцтве ў бягучым годзе памяшканьня для інстытуту ня выконваецца.

Нічога ня зроблена ў галіне перабудовы работы гэтай ВНУ. За паўтары гады інстытут не абсталяваў ні аднэй тэхнічнай катэдры і навучальных габінэтаў для асноўных аддзяленьняў: мэханічнага, эканамічнага і эксплёатацыйнага.

Інстытут не забясьпечан навуковымі работнікамі, што выклікае прагулы цэлых аддзяленьняў (эканамісты трэцяга курсу і эксплёатацыйнага аддзяленьня).

З прычыны дрэннага падбору частка навуковых работнікаў, некаторых з іх прыходзіцца зьнімаць у часе прахаджэньня цыклю (агра-статыстык Еліпкін).

Катэдры інстытуту зусім адарваны ад вытворчасьці. Такой важнай справе, як мэханізацыя лесазагатовак, у курсе катэдры эксплёатацыі амаль не адведзена месца.

Асабліва дрэнна стаіць справа ў галіне вытворчай практыкі. Напрыклад, студэнты трэцяга курсу эканамічнага аддзяленьня за ўвесь час вучобы на практыцы былі толькі адзін раз.

Ва ўсёй праграме гэтага аддзяленьня пройдзен толькі адзін прадмет: рахункаводзтва і балянсаўтва. На пасаду эканамістаў пасылаюцца людзі, якія не прайшлі ніводнага эканамічнага прадмету.

Неабходна зараз-жа праверыць становішча кожнага аддзяленьня ў галіне выкананьня навучальных плянаў і вытворчай практыкі. Устанавіць дакладна профіль спэцыяліста, узмацніць сувязь інстытуту з вытворчасьцю.

Гомельскі гарсавет павінен неадкладна адвесьці інстытуту патрэбнае памяшканьне.

Патрэбна дабіцца таго, каб лесатэхнічны інстытут выпускаў усебакова падрыхтаванага спэцыяліста.

Ё. Г. Б.



НА ДНЕПРАБУДЗЕ. ПАНАРАМА ПЛАЦІНЫ

Год выданьня—XV
№ 293 (4199)
Аўторак, 27 кастрычніка
Цана нумара 5 кап.
ВЫХОДЗІЦЬ БЕСЬПЕРАПЫННА

Зьвязда

Органа ЦК Мен. Гаркому Камуністычнай партыі (б) Беларусі.

РЭДАКЦЫЯ І КАНТОРА
МЕНСК, САВЕЦКАЯ, 63.
Тэлефоны:
рэдактар—4-27,—сакратар—10-74, партсэктар—13-80, прамысл.—13-60, сек. земл.—6-19, мясц. інфарм.—6-19, замеж. інфарм.—6-19, навукі рэдактар—6-12, літаратурны рэдактар—10-74, выпраўленьні—81, адказны сакратар—7-21

Японія працягвае наступленьне ў Манчжурыі

пад шумок жэнэўскай балбатні

Замест эвакуацыі—новая акупацыя

Пад відам ліквідацыі „бандытызму"

МУКДЭН. 24. Афіцыяльна паведамляецца, што ў раёны Чжэцзятун (чыгуначны пункт на лініі Таонань-Сыпінгай), Сыпінгай, а таксама ў Мукдэнскі і Анадунскі раёны адпраўлены японскія часьці для ліквідацыі «бандытызму».

САЛІДАРНАЙ ЗАБАСТОЎКАЙ пекары Тарнопаля перамаглі

ВАРШАВА, 25. У Тарнопалі скончылася забастоўка пекароў. Забастоўка выклікана тым, што прадпрыемцы прымушалі рабочых працаваць па 14-16 гадзін у дзень, а з пятніцы на суботу па 20 гадзін бесьперапынна.

Забастоўка распачалася 18 кастрычніка. Ня гледячы на тое, што прадпрыемцы імкнуліся пры дапамозе паліцыі і штрэйкбрэхераў змазаць забастоўку—пекары салідарнай барацьбой перамаглі.

Прадпрыемцы задаволілі дамаганьне рабочых аб 8-мі гадзінным дні працы без паніжэньня зарплаты.

Чыгункамі кіруюць акупанты

ТОКІЁ. 25. Карэспандэнт «Асакі» паведамляе з Мукдэну, што 23-га кастрычніка адбылася нарада прадстаўнікоў 4-х чыгунак (Мукдэн-Хайлун, Таонань-Цыцыкар, Гірынь-Лунхуа і Сыпінгай-Таонань) з удзелам новага мэра Мукдэну. Нарада стварыла «паўночна-ўсходнюю чыгуначную камісію», якая аб'ядная ўсе кітайскія чыгункі ў Манчжурыі. Японскія ўлады прызналі гэту камісію. Камісія абвясьціла, што яна прыступае да кіраваньня ўсімі чыгункамі ў Манчжурыі.

Байкі аб „бандыцкіх" нападах

ТОКІЁ. 25. Агенцтва «Рэнго» паведамляе з Гангуня: «учора вечарам кітайскія «бандыты» напалі на Кончунін, дзе адбылася бойка паміж бандытамі і японскай паліцыяй. У сутычцы забіт адзін японец і адзін паранен. Аб стратах кітайскага боку не гаворыцца».

„Пастанова Лігі Нацый—нікога не абавязвае"

ТОКІЁ. 25. Як паведамляе «Сімбун Рэнго», у аўтарытэтных японскіх колах лічаць, што пастанова Лігі Нацый ад 24-га кастрычніка пазбаўлена юрыдычнай моцы і ня можа абавязаць кітайскі ўрады. Таму, Японія не абавязана падпачальваць пастанове і гатова дабіцца вырашэньня канфлікту, шляхам непасрэднага перагавораў, у адпаведнасьці з пунктамі, распрацаванымі японскім урадам. «Калі-ж кірайскі ўрад спадзяецца па матчымасьць данамогі з боку Лігі Нацый і ўстрымаецца ад перагавораў, адказнасьць за сучаснае становішча павінна быць ускладзена на Кітай».

Японія „дагаварваецца" сама з сабою

ТОКІЁ. 25. Сёньня ў 2 гадзіны пачалася экстраная нарада савету міністраў. Нарада павінна разгледзець становішча якое стварылася пасьля прыняцьця пастановы Лігі Нацый ад 23-га кастрычніка аб неабходнасьці эвакуацыі японскіх войск з Манчжурыі. Газэта «Асакі» піша: «учора савет міністраў прыйшоў да вываду, што ад Лігі Нацый няма чаго чакаць. Необходна ўзяць ініцыятыву ў свае рукі і прыступіць да перагавораў, непасрэдна з нанкінскім урадам, а таксама з новымі мясцовымі ўладамі Манчжурыі для вырашэньня канфлікту незалежна ад Лігі Нацый». Савет міністраў даручыў Сідэхару ў гэтых адносінах прыняць адпаведныя меры.

Вялікі рост уплыву кампартыі Нямеччыны

Буйныя страты сацыял-фашыстаў

на выбарах у акруговыя парляманты

БЭРЛІН, 26. Учора ў Сярэдняй Нямеччыне адбыліся выбары ў акруговыя парляманты і вобшчынныя самакіраўніцтвы. Выбары прайшлі пад знакам вялізнага росту галасоў кампартыі пры адначасовым буйных стратах сацыял-дэмакратаў і іншых буржуазных партый.

У Дэсэў у выбарах у АКРУГОВЫ ПАРЛЯМАНТ прымала ўдзел 90 проц. усіх выбаршчыкаў. Кампартыя атрымала 8.560 галасоў (на выбарах рэйхстагу 1930 г. 6.920 галасоў), тры мандаты (на выбарах акруговага парляманту ў 1927 г. —1 мандат). Сацыял-дэмакраты атрымалі 7 мандатаў (9). Нацыянал-сацыялісты (фашысты) атрымалі 8 мандатаў (0). Нацыянальны блёк, які яднае народную партыю, гаспадарчую партыю, нацыяналістаў і групу Ляндбунда — 2 мандаты (8). Дзяржаўная партыя не атрымала ні аднаго мандату, у той час, як да гэтых пор у яе было 2 мандаты.

На выбарах у АКРУГОВЫ ПАРЛЯМАНТ у Бэрнбурзе кампартыя атрымала 4 мандаты (3), сацыял-дэмакраты — 7 мандатаў (8), фашысты—6 мандатаў (0), нацыянальны блёк—3 (8), дзяржаўная партыя — 0 (1). На выбарах у акруговы парлямант у Цэрбоце кампартыя атрымала 2 мандаты (1), сацыял-дэмакраты —5 (6). фашысты — 7 (0), блёк буржуазных партый — 2 (7), дзяржаўная партыя — 0 (2).

У Кентоне кампартыя атрымала на выбарах у АКРУГОВЫ ПАРЛЯМАНТ 2 мандаты (0); сацыял-дэмакраты — 6 мандатаў (7); нацыянал-сацыялісты — 6 (0); нацыянальны сьпіс— 2 (7); дзяржаўная партыя — 0 (2).

На выбарах у вобшчынае самакіраўніцтва ў Дэсэў кампартыя атрымала 4 мандаты (2); сацыял-дэмакраты атрымалі 13 мандатаў (14); нацыянал-сацыялісты — 15 мандатаў (0), нацыянальны блёк — 2 мандаты (11); дзяржаўная партыя 0 (3), домаўласьнікі — 2 (4).

На ВОБШЧЫННЫХ ВЫБАРАХ у Бэрнбурзе камуністы атрымалі 4 мандаты (4), сацыял-дэмакраты—10 мандатаў (11); нацыянал-сацыялісты—11 мандатаў (0), аб'яднаны нацыянальны сьпіс —2 мандаты (9); дзяржаўная партыя — 0 (1), аб'яднаньне сярэдніх пластоў — 3 (5).

Кентоне на вобшчынных выбарах кампартыя атрымала 2 мандаты (0); сацыял-дэмакраты—11 мандатаў (13), нацыянал-сацыялісты — 12 мандатаў (1); буржуазны блёк—2 мандаты (13), сьпіс нацыянальнага цэнтру — 2 (3).

На вобшчынных выбарах у Пэбсьце камуністы атрымалі 4 мандаты (2), сацыял-дэмакраты — 7 (10), нацыянал-сацыялісты — 10 (0), буржуазны блёк — 3 (10), дзяржаўная партыя — 0 (2).

Як відаць з гэтых лічбаў, нацыянал-сацыялістычная партыя навялічыла колькасьць сваіх галасоў, выключна за лік буржуазных партый, у той час, як камуністычная партыя атрымала галасы сацыял-дэмакратычных рабочых, якія хутка рэвалюцыянізуюцца.

На вытворчай практыцы.

„КААЛІЦЫЯ БРУНІНГ—ГІТЛЕР канкрэтная магчымасьць бліжэйшага часу"

БЭРЛІН, 26. У блізка стаячых да ўраду колах працягваюць інтэнсіўна абмяркоўваць магчымасьць стварэньня ўрадавой каліцыі «БРУНІНГ-ГІТЛЕР». Друк таксама ўзмоцнена займаецца гэтым пытаньнем. Газэты народнай партыі і цэнтру гавораць аб «палітычным сынтэзе» Брунінг-Гітлер, як аб канкрэтнай магчымасьці бліжэйшага часу. Старшыня народнай партыі Дынгельдзей у сваёй прамове ў Гале на канфэрэнцыі народнай партыі таксама энэргічна патрабаваў каліцыі Брунінга з Гітлерам.

Вялізарнае дасягненьне савецкай авіяцыі

Вынайдзен новы тып лётнага апарату—„Вертолет"

Канструктарскай групай «Каскр» пры Авіяздзеле Асоавіяхіму СССР з 1928 г. у грамадзкім парадку вялася работы па распрацоўцы мэтадаў разьліку, праектаваньні, пабудове і выпрабаваньні новага тыпу флётнага апарату «ВЕРТОЛЕТА».

Пасьля некалькіх няўдач, нарэшце, удалося пабудаваць і дабіцца значных посьпехаў у канструяваньні і выпрабаваньні савецкага «Вертолета». Машына, у адрозьненьне ад самалёту, ня мае крыльляў, лётае на вінтох і не адчувае патрэбы ў спэцыяльным аэрадроме. Яна можа спускацца на вельмі невялікія пляцоўкі (у 20-30 мэтраў), свабодна парашутуе пад вялікімі кутамі без матора з вышыні некалькіх соцень мэтраў. Машына можа лётаць на вялікіх і на вельмі малых гарызантальных хуткасьцях (каля 35 клм. у гадзіну). Кіраваньне ў паветры і пры ўзьлёце—пасадцы вельмі простае. Машына ўстойлівая і бясьпечная. У далёкашым намі будзе прапрацоўвацца пытаньне аб узьлёце з месца, пявялічэньне максымальнай гарызантальнай хуткасьці і хаткаўздымнасьці.

У бліжэйшым будучым «Вертолет» у нашых умовах павінен знайсьці сабе шырокае дастасаваньне ва многіх вобласьцях Савецкай авіяцыі, напрыклад: для сувязі з месцамі без аэрадромаў, для арктычных палётаў, для палётаў у горных вобласьцях, для барацьбы са шкоднікамі сельскай гаспадаркі, аховы лясоў ад пажараў і г. д., для вышуканьня паветраных ліній чыгунак і шасэйных дарог, для аэра-фотаздымак, для санітарнай службы (паветраная карэта хуткай дапамогі), для ўсіх іншых відаў шырокага ўжываньня (лёгкі тып).

Машына цалкам пабудавана з савецкіх матар'ялаў і савецкімі спэцыялістамі.

„Палепшыць бытавыя ўмовы рабочых—такава задача" (Сталін)

ВЫКЛЮЧНА ДРЭННАЕ ПЛЯНАВАНЬНЕ БУДАЎНІЦТВА

тармозіць выкананьне плянаў гарадзкога дабрабыту

МАБІЛІЗАВАЦЬ УСЕ СІЛЫ НА ХУТЧЭЙШАЕ АЖЫЦЬЦЯЎЛЕНЬНЕ ПАСТАНОВЫ ЦК І СНК САЦЫЯЛІСТЫЧНАЙ РЭКАНСТРУКЦЫІ КАМУНАЛЬНАЙ ГАСПАДАРКІ г. МЕНСКУ

На нарадзе пры „Зьвязьдзе"

Больш двох тыдняў прайшло з часу выданьня пастановы ЦК КП(б)Б і СНК БССР аб сацыялістычнай рэканструкцыі г. Менску. Задачы праверыць ход выкананьня гэтай пастановы, выявіць усе хваравітыя бакі камунальнага будаўніцтва, усе тормазы па шляху ператварэньня Менску ва ўзорны пралетарскі цэнтр—была прысьвечана шырокая нарада па камунальным будаўніцтве, якая адбылася 24 кастрычніка ў рэдакцыі «Зьвязды».

Прадстаўнікі ЦКК-НК РСІ і гарКК т. т. ЯКУБСОН і ФУРСАЎ азнаёмілі ўдзельнікаў нарады з вынікамі абсьледваньня жыльлёва-камунальнага будаўніцтва па г. Менску. Асноўныя вывады абсьледваньня ўжо зьмешчаны ў «Зьвязьдзе».

ЖЫЛКААПЭРАЦЫЯ ПРАЦУЕ ПАДРАДНІЦКІМІ МЭТАДАМІ

Асабліва падрабязна спыніліся дакладчыкі на дзейнасьці жыльлёвай кааперацыі. «Дзейнасьць» апошняй выразна характарызуюць некалькі лічбаў і фактаў. Гаржылсаюз узяўся будаваць 25 стандартных дамоў і выканаў плян будаўніцтва на 1,5 проц.; ён пачаў работы, ня маючы ніякіх тэхнічных сродкаў. Ня гледячы на пагрозу зрыву плян наванага будаўніцтва, Менскае аддзяленьне Белжылсаюзу бярэ новыя работы, праводзячы на справе палітыку старых падрадчыкаў. Ніхто не займаецца пытаньнем рацыяналізацыі—таму на ўсіх пабудовах наглядаецца значнае перавышэньне лімітаў.

Па Менску запраектавана стандартнае будаўніцтва на 841.000 руб. Плян ня выконваецца, бо Белжылсаюз ня правільна арганізаваў работы, займаецца саматужніцтвам у гэтай справе і пачаў будаўніцтва з вялікім спазьненьнем. Дагэтуль Белжылсаюз яшчэ «вывучае» пытаньне аб вырабе новых будматар'ялаў і ня ідзе далей вопытнай вытворчасьці. У некаторых работніках Белжылсаюзу наглядаецца яўная недаацэнка гэтай справы, кансэрватызм і нявер'е ў яе эфэктыўнасьць. Жыльлёвы фонд у надзвычай дрэнным становішчы. Жакты ня робяць нават дробных рамонтаў.

Аб тым, як жыльлёвая кааперацыя мабілізуе сродкі для разгортваньня будаўніцтва, гавораць лічбы—мэўклівыя сьведкі ганебнай работы ЖБКТ і жактаў у гэтай галіне: запас чанасьць па арэндным плацё дасягае 200.000 руб., пэўу сабрана на 91.000 руб. замест 300.000. Як назваць пазоўзіны работнікаў жыльлёвай кааперацыі, якія пасьля гэтага адважваюцца скардзіцца на адсутнасьць сродкаў? Белжылсаюз пры падтрыманьні гарсавету адважыўся нават прасіць СНК БССР аб водпуску дадатковых сродкаў у разьмеры 1.555.000 руб.

Тут мы маем справу з яўным замазваньнем сапраўднага становішча жыльлёвага будаўніцтва.

Грамадзкасьць жактаў ня прыцягнута да вырашэньня задач камунальнага будаўніцтва, Санітарныя і культурныя камісіі —«мёртвыя душы», будаўнічыя камісіі існуюць толькі ў пунктах пратакопаў праўленьняў.

ПАСТАНОВА ЦК І СНК НАКЛАДВАЕ ВЯЛАЗАРНЫЯ АБАВЯЗКІ НА ЖЫЛЬЛЁВУЮ КААПЭРАЦЫЮ, ЯНА МОЖА З ІМІ СПРАВІЦЦА ТОЛЬКІ ПРЫ КАРЭННАЙ ПЕРАБУДОВЕ ЎСЁЙ РАБОТЫ.

АГІДНАЯ БЛЫТАНІНА Ў БУДАЎНІЦТВЕ

Вельмі жывыя спрэчкі па дакладах, у якіх прынялі ўдзел рад кіруючых работнікаў НК камунальнай гаспадаркі, гарсавету, камгасу, аддзелу дабрабыту, Дзяржпляну, Камунбанку і будуючых арганізацый далі выразны малюнак становішча камунальнага будаўніцтва, выкрылі карэньні прарываў у разьвіцьці гарадзкой гаспадаркі.

Амаль усе скардзіліся на БЯСПЛЯНАВАСЬЦЬ, якая падрывае ўсю работу, якая выклікае зрыў тэрмінаў будаўніцтва, падаражэньне сабекошту работ і новыкананьне заданьняў па дабрабыце. Вялікая доля віны падае тут на Дзяржплян і Менгарсавет.

Выступаўшыя т. т. БРОДКІН (Камунбанк), СТОЛЯР (Менбуд), ГОЛЬДВАСЭР (Белжылсаюз), інж. КЛІМАЎ, СТАНКЕВІЧ (Водаканалбуд) і КАПЛАН (камгас) і інш. правялі дзясяткі прыкладаў парушэньняў плянавасьці работ. Колькі раз на працягу лета то абвалічалі пабудову ўдарнай, то кансэрвавалі яе, колькі раз вазілі матар'ял з адзіай пабудовы на другую! Ці ня мала было выпадкаў, калі высякалі сад, прывозілі матар'ялы, ставілі агарожы і на гэтым канчалі. На перакідваньне матар'ялаў патрачаны марна дзесяткі тысяч рублёў. Важнейшыя пабудовы зусім ня ўключаны ў плян будаўніцтва (водаправод, асэнізацыйная база), апошнія анархічнымі мэтадамі вырывалі будматар'ялы, мяняліх і тым уносілі яшчэ большую блытаніну ў ход будаўніцтва.

Даволі характэрныя факты. Да чэрвеня месяца аддзел дабрабыту ня ведаў, якую вуліцу брукаваць і чым. Матар'ялы атрымлівалі з перабоямі, урыўкамі. Клінкер атрымалі толькі ў жніўні. У Крупках адабралі 56 вагонаў каменю прызначанага Менску. Брусчатку здабылі пасьля доўгіх клопатаў і паездак.

Бяспляновыя раскопкі і падземныя работы надзвычай тармазілі брукаваньне вуліц. Даволі сказаць, што і ў будуючым годзе, як прызнаўся інж. Клімаў, магчымы новыя раскопкі забрукаваных у гэтым годзе вуліц—разгорнуцца работы па будаўніцтве цэплаэлектрацэнтралі. Дазіны выхад — СТВАРЭНЬНЕ ЦЬВЁРДАГА І ВЫРАЗНАГА ПЛЯНУ РАЗЬВІЦЬЦЯ ПАДЗЕМНАЙ ГАСПАДАРКІ.

«МЫ САМІ САБЕ ГАСПАДАРЫ»

Паасобныя арганізацыі груба парушаюць пляны дабрабыту гораду. Без дазволу камгасу Белжылсаюз будуе дом на дварэ ЦВК. У Брылёўскім завулку на дварэ пастанове камгасу, пабудаваў ракор пастанове камгасу, пабудаваў хлеў на Чэрвеньскім тракце. На вуліцы Карла Маркса забрукавалі клінкерам разгалінаваньні водаправоду.

Выступаўшыя скардзіліся на недахват будматар'ялаў, эвальвалі ўсю віну на Дзяржплян. Але тав. Якубсон і інш. радам прыкладаў даказалі, што справа галоўным чынам не ў недахвацe будаўнічых матар'ялаў, а ў іх НЯПЛЯНАВЫМ РАЗЬМЕРКАВАНЬНІ. Праверка НК РСІ выявіла, што на радзе пабудоў ёсьць вялікія залежы непатрэбных тэм матар'ялаў. У адным месцы знайшлі 200 тон каналізацыйных труб, вельмі патрэбных Водаканалбуду. Нама вагона цэмэнту для 62-хкватэрнага дому Белдартрансу, між тым тры вагоны ляжаць на бясплянавай пабудове навучальнага корпусу Белдартрансу. У той час, калі некаторыя пабудовы задыхаюцца ад адсутнасьці матар'ялаў, на іншых вялюцца тоны непатрэбных ім прыпад. ПАТРЭБЕН АДЗІНЫ БУДАЎНІЧЫ ЦЭНТР, ЯКІ КІРАВАЎ-БЫ БУДАЎНІЦТВАМ. Такі цэнтр арганізаваны ў асобе «Камунбуду», але ён яшчэ не разгарнуў работы.

СТАНОВІШЧА ДАБРАБЫТУ

У спрэчках шмат гаварылі аб становішчы дабрабыту гораду. Менскі водаправод існуе 55 год, ён знасіўся, забясьпечвае патрэбы гораду ня больш, чым на 40 проц. Будаўнітва новага водаправоду тармозіцца з-за дрэннага забясьпячэньня матар'яламі — 5-6 проц. патрэбы.

На чацьверты квартал, ня гледзячы на выразныя дырэктывы, пабудове водаправоду будматар'ялы ня вызначаны.

У выніку—выканана толькі 25 проц. пляну ўключэньня дамоў у каналізацыю, а пабудова станцыі ў Нав знаходзіцца пад пагрозай.

Лазьня-пральная гаспадарка —у звычай дрэнным становішчы. Пра можа абслужыць толькі 5 проц. нас ніцтва. Лазьні задавальняюць пат насельніцтва ў зусім мізэрных раз рах. Між тым, будаўніцтва новай л ні і пральні ідзе чарапашымі тэм ні і пральні пабудовам ні гарсавет, ні бо гэтым пабудовам ні камунальная гаспадарка не аддаюц лежнай увагі.

У гэтым годзе ўпяршыню частка ліц апранулася ў клінкер і брусч але за шыльдай гэтых дасягне халаецца эрыў пляну брукаваньн волі сказаць, што ў 1930 годзе забр вана і перабрукавана 94.000 кв. м. гэтым годзе 29.800 кв. м. Хто дась камгасу права зьмяншаць плян да быту?

За гэтыя прарывы цалкам адка і Менгарсавет, які не правяў належ настойлівасьці ў выкананьні пляна даўніцтва, які, да рэшты, яшчэ ман на не абгаварваў пастановы ЦК і С

ПЕРАМАГЧЫ ТРУДНАСЬЦІ

Выступаўшыя зусім правільна ад чылі, што Менск будуецца нячува раней тэмпамі, Менск расьце, з маш скага гораду ён становіцца культур індустрыяльным цэнтрам, прарыв недарачнасьці на паасобных вучас могуць і павінны быць ліквідав бальшавіцкай няўхільнай, настойлів ўпартай барацьбой за ажыцьцяўле пастановы ЦК і СНК аб сацыялісты най рэканструкцыі гарадзкой гаспа кі.

Прадстаўнік вызнной радэкцыі черняя Москва» тав. СЭЙФІ, азна шы прысутных з вопытам сацрэ структуры камунальнай гаспадарк ны і барацьбой газэты за здарэньн ладкрасьліла, што Менск удала п мае вопыт сталіцы СССР і з кож годам зьмяняе свой ранейшы тавар мен дасягненьнямі ў камунальнай падарцы пазнікі дапамагчы рашэ наплаванню дабрабыту Менску і ўскраіні.

Выступіўшы з прамовай нам. ста ні гарпрафсавету тав. КУДРАЕЎ ад чыў, што толькі пры ўмове ўдзе ня шырокай пралетарскай грамадз ці можна дабіцца рашаючых посьп у паляпшэньні камунальнай гаспа сталіцы БССР, у справе ператвар Менску ва ўзорны, перадавы прал скі цэнтр.

Е. Б—

СЭЙФ

„Вечерняя Москва"—у барацьбе за дабрабыт сталіцы

Пасьля сканчэньня работ чэрвеньскага пленуму ЦК УсеКП(б) газэта «Вечерняя Москва» рэзка зьмяняе свой твар і кірунак. З газэты, якая афіцыяльна падае матар'ял, па сутнасьці мала цікавы для шырокага чытача, яна ператвараецца ў жывую цікавую газэту маскоўскага гарадзкога камітэту УсеКП(б). Ранейшая «Вечорка» робіцца непазнаванай, яна пачынае па-баявому асьвятляць пастановы чэрвеньскага пленуму ЦК, займаецца спэцыяльным пытаньнем ператварэньня Масквы ва ўзорную сацыялістычную сталіцу.

Сумесна з органамі кантрольнай камісіі і МРСІ газэта арганізуе масавы кантроль і праверку выкананьня пастановаў чэрвеньскага пленуму, памятаючы, што «газэта ня толькі калектыўны агітатар і прапагандыст, але і калектыўны арганізатар». Тут-жа газэта і знаходзіць свой сапраўдны твар, свайго масавага пастаяннага чытача.

У жывой, зразумелай форме яна дае яркія ўзоры першых дасягненьняў у галіне рэканструкцыі гарадзкой гаспадаркі, ускрывае наасобныя прарывы, прафілактычна адхіляе ўсё тое, што можа колькі-небудзь замарудзіць узятыя тэмпы на перабудове сталіцы. Вазьмеце любое кліше, — гэта ня проста малюнак, а наочная прадметная агітацыя. У № 246 «Вечерней Москвы» ад 15 кастрычніка ў цэнтры першай старонкі — вялікае кліше: пінэнэра Маруся Пімтова мые падлогу — «Вось хто практычна, а не на словах стаў пінэнэрам барацьбы за чыстату ў сваім доме».

Скажэце, ці да гэтага кліше патрэбен вялікі артыкул, калі гэта кліше заклікае, арганізуе, агітуе само па сабе? Вядома, не! Думка, выкладзеная ў кліше, зразумелая нават дзіцяці. Да таго-ж ёсьць сотні становых водгукаў і аб іншых кліше ад рабочых камунальных прадпрыемстваў, якія лічаць «Вечернюю Москву» сваёй газэтай.

У нашым распараджэньні нумары «Вечерней Москвы» толькі за кастрычнік. Часткова гэта добра, бо ацэнку газэты за верасень мы маем у газэце «Известия» УсеЦВК СССР, дзе была асабліва адцэнена паказальная роля «Вечерней Москвы», як арганізатара і барацьбіта за чыстату жыцьця рабочага, за дробязі быту.

У кастрычніку «Вечерняя Москва» сканцэнтравала сваю ўвагу на рэканструкцыі гарадзкой гаспадаркі. Забрукаваньне вуліц Масквы, іх асфальтаваньне па-ранейшаму застаецца ў цэнтры ўвагі, бо іменна ў кастрычніку вытворчая праграма павінна быць выканана без найменшага аслабленьня тэмпаў, незалежна ад становішча надвор'я.

Новае будаўніцтва і рамонт дамоў займаюць вялікае месца ў газэце. Аб матэрыялітэне, аб палацы Саветаў, аб тым, што праз год да палацу Саветаў будзе прыладзен новы мост — гэменны, сталёвы, аб «Шарыкападшыпніку»—заводзе хутасьцяй, — вось аб чым пісала «Вечерняя Москва».

Пісала і аб тым, што ля Астанкіна, пад Масквою, вырас студэнцкі гарадок на месцы, дзе яшчэ нядаўна было сьмецьце і вылі адзіхэльных сабак.

Быстрачальная ўвага аддана і тэмпам новага будаўніцтва — пабудове паверхаў, з ілюстрацыяй усяго дасканалымі лічбамі, якія сьведчаць аб размаху бальшавіцкага наступленьня на жыльлёвым фронце.

Шмат зьмешчана лістоў жыхароў неадрамантаваных дамоў, якія раскрываюць абуравочы малюнак таптаньня на месцы паасобных домакіраўніцтваў, жактаў, саюзу жактаў. Ня толькі пісалася ў газэце, але пасылаліся ўдарныя брыгады, арганізоўваліся рэйды, працавалі выязныя рэдакцыі на жактах, дабіваючыся, каб жыхары аказвалі канкрэтную дапамогу домакіраўніцтвам. Мы ведаем сотні выпадкаў, калі рабочая грамадзкасьць у дамох адолела дабіцца зьдзяйлючых посьпехаў у справе рамонту і прывядзеньня кватэр у парадак. Між тым вельмі многія жыхары звычайна выяўляюць сваю актыўнасьць толькі на сходах жыхароў, дзе яны прад'яўляюць самыя рознастайныя патрабаваньні, але нічога ня робяць пасьля сходу для таго, каб дапамагчы домакіраўніцтвам выканаць гэтыя патрабаваньні.

Да сканчэньня тэрміну рамонту засталіся лічаныя дні. Зараз шмат лягчэй атрымаць выстарчальную колькасьць рабочых рук. Гэтыя рукі павінны быць неадкладна прыведзены ў рух для завяршэньня рамонту.

— Сьвятло, апал, вада — пытаньні, якія цікавяць любога жыхара Масквы— ня выходзілі са старонак газэты і ў кастрычніку, як і ў жніўні і верасьні:

«Маскоўскі электрабалянс 1931 году складае мільярд кілёват гадзін. 8 электрычных чалавекасіл падае на аднаго масквіча. Гэта дае права рабочаму выдаліць з прадметаў свайго ўжытку прымус, замяніўшы яго электранагравальнымі прыладамі».

Або: «Дасягнуўшы ў бягучым годзе мільярда кілёватгадзін, Масква ў будучым годзе закончыць сваю электрафікацыю і зусім па трэба будзе зьдзіўляцца, калі ўжо ў бліжэйшыя годы Масква пакіне заваду Бэрлін».

Пісалі і аб цёплафікацыі Масквы. І ня толькі пісала «В. М.», але і на-бальшавіцку змагалася і змагаецца за выкананьне гэтай важнейшай задачы — да канца другой пяцігодкі поўнасьцю цёплафікаваць Маскву. Не забудзем аб тым, што цёплафікацыя Масквы патрабуе каронная рэканструкцыі ўсёй Маскоўскай энэргетычнай гаспадаркі.

Цёплафікаваць — значыць ліквідаваць усе «дрывяныя» і «вугольныя» печы і пліты, усе кацельныя ўстаноўкі для цэнтральнага ацяпленьня ў жылых домах, установах і прадпрыемствах.

Задача нялёгкая, але «Вечерняя Москва» з ёю пакуль спраўляецца, аказваючы дапамогу ў гэтым пачынаньні гаспадару Масквы — Маскоўскаму савету.

Пісалі і аб маскоўскім водаправодзе і абвадненьні Масква-ракі, пануарызуючы на масавых і спэцыяльных парадах рэдакцыі праекты інжынэра Аўдзеева і інш.

Біла «Вечерняя Москва» і на непаладках у загатоўках і забясьпячэньні насельніцтва апалам. У гэтай галіне газэта, ідучы побач з органамі кантрольнай камісіі УсеКП(б) МРСІ, дабілася буйнейшых рэзультатаў і парадку, асабліва на дрывяных рынках, у частцы разгрузкі і разьмеркаваньня апалу.

Кліч нашай партыі аб дабрабыце Украіны знайшоў поўны адбітак у работе масавага сэктару «Вечерней Москвы». «Вечерняя Москва» абвясьціла конкурс на выхадзіл